# Палітыка памяці ў Беларусі. Мемарыялы Другой сусветнай вайны і меншасці краіны (яўрэйская, польская ды цыганская)

АНДРЭЙ КАТЛЯРЧУК*

*Никто не забыт, и ничто не забыто!*
Вольга Бергольц, 1960 г.

Лозунг савецкай палітыкі памяці Вялікай айчыннай вайны

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца тлумачэнне апошніх тэндэнцый у сучаснай палітыцы памяці Беларусі на прыкладзе новых помнікаў ахвярам Галакосту, генацыду цыганоў і помнікаў на месцах забойства прадстаўнікоў польскай меншасці[1]. Аўтар мяркуе, што для правядзення аналізу сучаснай беларускай палітыкі памяці ў дачыненні да Другой сусветнай вайны прыдатная тэорыя *path dependence*, згодна з якой абмежаванні новай палітыкі дэтэрмінаваны палітычным выбарам, які быў зроблены раней іншым палітычным рэжымам. Апошнія працы параўнальнай паліталогіі адаптавалі канцэпцыю "path dependence" да гістарычнага матэрыялу (Hedlund 2005). З гэтага пункта гледжання паўнавартасны аналіз сучаснай беларускай мемарыяльнай палітыкі немагчымы без даследавання савецкага перыяду ў палітыцы памяці.

На прыкладзе мемарыялізацыі Галакосту ў Польшчы і Славакіі Джэфры Блутэнгер вызначае тры асноўныя падыходы (*basic approach*) да рэалізацыі палітыкі памяці, якія былі характэрныя для ўсходнееўрапейскіх краінаў. Пры першым падыходзе (*aphasia*), характэрным для камуністычных часоў, накладвалася фактычнае табу на памяць. Пазней, у часе другой фазы (*deflective negotionism*), Галакост прызнаваўся, але ўся адказнасць за яго пераносі-

* Андрэй Катлярчук – старшы выкладчык Інстытута найноўшай гісторыі Ўніверсітэта Сёдэрторн (Södertorn University).

[1] Гэтае даследаванне было падтрымана "Foundation for Baltic and Eastern European Studies" (Stockholm). Аўтар удзячны Юрыю Гардзееву, Яраславу Крывому, П. А. Рудлінгу (Per Anders Rudling), Таміславу Дулічу (Tomislav Dulic), Уладзіміру Шчэрбаву, Аляксею Ластоўскаму і двум ананімным рэцэнзентам за крытычныя каментары і парады.

лася выключна на немцаў. Пры гэтым праблема мясцовай калабарацыі замоўчвалася. Нарэшце, трэці падыход (“open examination”) прадугледжвае зняцце ўсіх табу (Blutinger 2010, 73–74). З гэтага пункта гледжання цікава высветліць, у якой фазе знаходзіцца сучасная Беларусь.

Тэарэтычная мадэль артыкула заснавана на канцэпцыі месцаў памяці, якая была распрацавана П’ерам Нара і Лоўрэнсам Крыцманам. Названыя даследнікі сцвярджаюць, што, вызначаючы наша стаўленне да мінулага, памяць фармуе будучыню. Месцы памяці, якія разглядаюцца даследнікамі вельмі шырока (у гэтай якасці згадваюцца выявы на манетах, банкнотах або мастацкія кінафільмы), з’яўляюцца надзвычай магутным фактарам кансалідацыі нацыі і мабілізацыі этнічных груп. Праз месцы памяці адбываецца працэс улучэння калектыўнай памяці этнічнай меншасці ў агульнанацыянальны кантэкст (Nora and Kritzman 1996 і 1997).

Уладу цікавіць не ўласна гісторыя, а памяць пра пэўныя падзеі, што заўсёды мае моцна заангажаваны палітычны сэнс. Цікава прасачыць гісторыю праектаў *публічных* скульптурных і архітэктурных манументаў, якія не атрымалі згоды ўлады на рэалізацыю (не прайшлі конкурсу) і ніколі не былі ажыццёўлены. Калі гісторыя з’яўляецца навукай і грунтуецца на крытычным асэнсаванні падзеяў мінулага, што магчыма рэалізаваць з дапамогай крыніцазнаўства, памяць знітавана са сферай сучаснай палітыкі і мэтанакіраваным стварэннем гістарычнага міфа, які здольны аб’яднаць розныя этнічныя і сацыяльныя групы грамадства.

Мемарыяльная палітыка крышталізуецца ў месцах памяці, з якіх найбольш уплывовымі лічацца мемарыялы, бо менавіта праз іх ствараецца фізічная прастора памяці, якая злучае разам гістарычную падзею, дзень ушанавання і ўдзельнікаў цырымоніі (Baer 2000, Pickford 2005). Мемарыял надае ландшафту сакральны змест, з дапамогай якога ствараецца нацыянальная іканаграфія сучаснай дзяржавы. У дэмакратычнай дзяржаве палітыка памяці з’яўляецца агульным полем дзеяння ўлады і грамадства, якое, у сваю чаргу, мае моцныя рычагі ўплыву (незалежныя СМІ і г. д.). У таталітарнай дзяржаве ўрад фактычна мае манаполію на публічную памяць, вызначаючы, што грамадзянам трэба памятаць, а што – забыць (Schäuble 2011, 24).

Звычайны мемарыял памяці ахвяраў вайны змяшчае наступную інфармацыю: сціслае апісанне і храналогію трагічных падзеяў, колькасць або спіс ахвяраў, звесткі пра злачынцаў і зварот да нашчадкаў. Важнае значэнне мае не толькі скульптурная кампазіцыя, але і месца, абранае уладай для помніка (цэнтральны ці маргінальны пункт культурнага ландшафту). Вялікую ролю адыгрывае мова/мовы помніка. Гэтак, незразумелая для большасці насельніцтва мова адсылае да этнічнага зместу месца памяці, нават калі сама

этнічнасць не згадваецца наўпрост. У большасці выпадкаў да надпісу на мове меншасці дадаецца надпіс на дзяржаўнай мове. Менавіта так выглядае практыка большасці еўрапейскіх краінаў, і Беларусь тут не выключэнне.

Надпіс на грамадскім помніку зацвярджаецца ўладай і з'яўляецца апошнім асвечаным і залітым у бетон поглядам дзяржавы на падзеі мінулага. Працэс манументалізацыі новага канону гістарычнай памяці патрабуе часу. Агульныя рысы гэтага працэсу можна адлюстраваць наступным чынам:




**"Кожны чацверты". Другая сусветная вайна і яе ахвяры ў Беларусі**

Беларусь – адна з найбольш пацярпелых у Другой сусветнай вайне краінаў Еўропы. Як паведамляе афіцыйная статыстыка, людскія страты склалі больш за 2,2 мільёна чалавек; на прымусовую працу ў Германію было вывезена 380 тысяч маладых людзей (Пасэ 1994, 433–434). Як адзначыў Віталь Сіліцкі, страты беларускага насельніцтва ў вайне былі "большыя, чым французскія, брытанскія і амерыканскія страты, разам узятыя. Шэсць сотняў вёсак былі спалены разам з жыхарамі, і жыццё ніколі не вярнулася ў 200 з іх. Фактычна кожны буйны горад краіны ляжаў у руінах. Агульная колькасць насельніцтва дасягнула даваеннага ўзроўню толькі ў сярэдзіне 1970-х гадоў" (Silitski 2005).

Як вядома, у публічнай прасторы сучаснай Беларусі найбольш часта перыяд 1941–1945 гг. вызначаецца як "Вялікая айчынная вайна", што склалася яшчэ ў савецкі час. Беларускія навукоўцы карыстаюцца абодвума паняцця-

мі – “Другая сусветная вайна”, калі гаворка ідзе пра перыяд 1939–1941 гг. або пра вайсковыя аперацыі хаўруснікаў па-за межамі СССР, і “Вялікая айчынная вайна”, калі гаворка ідзе пра перыяд нацысцкай акупацыі БССР. Як адзначае П. А. Рудлінг, менавіта Другая сусветная вайна сталася падмуркам выбудовы сучаснай беларускай ідэнтычнасці. Фактычна няма іншай гістарычнай падзеі, якая б мела мацнейшы ўплыў на сучасную Беларусь (Рудлінг 2010, 91). Невыпадкова, што гэтая нацыянальная траўма глыбока ўвайшла і ў публічны дыскурс, і ў самасвядомасць беларусаў. Беларуская мова амаль адзіная ў свеце, дзе слова “вайна” звычайна выкарыстоўваецца як сінонім Другой сусветнай вайны.

Упершыню дадзеныя пра больш за 2 мільёны загінулых жыхароў Беларусі з’явіліся падчас вайны ў адной з партызанскіх зводак, калі дакладныя падлікі зрабіць было немагчыма. У 1943 г. надзвычайная дзяржаўная камісія (Чрезвычайная государственная комиссия по установлению и расследованию злодеяний немецко-фашистских захватчиков и их сообщников) ацаніла колькасць ахвяраў БССР у 2,2 мільёна чалавек на 10 мільёнаў 454 тысячы насельніцтва па стане на 1 студзеня 1941 г. Гэтая лічба дзялілася ў савецкі час на 800 тысяч загінулых ваеннапалонных (большасць якіх, зрэшты, не былі грамадзянамі БССР) і 1,4 мільёна грамадзянскага (цывільнага) насельніцтва (Нічога не забудзем 1943; Лицкевич 2009).

На падставе заяўленых лічбаў быў створаны міф пра “кожнага чацвертага жыхара рэспублікі”, які загінуў у часе вайны, што не адпавядала матэматычным разлікам. Аўтарам гэтага міфа быў Пётр Машэраў – фактычны кіраўнік БССР у 1965–1980 гг. Гэты беларус, былы камандзір партызанскага атрада і герой вайны (зорка Героя Савецкага Саюза 1944 г.) быў выбраны ў 1965 г. на пасаду першага сакратара Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі. У праграмным артыкуле, прысвечаным 20-годдзю перамогі ў Другой сусветнай вайне, Машэраў заявіў: “Вайна адабрала жыццё амаль кожнага чацвертага жыхара рэспублікі” (Машеров 1965). Гэтае сцверджанне кіраўнік рэспублікі паўтараў неаднаразова, напрыклад ва ўрачыстай прамове да 25-годдзя вызвалення БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (Машеров 1969)[2]. У 1970 г. аўтарытэтная крыніца “Беларуская савецкая энцыклапедыя” сцвярджала, што Беларусь страціла ў вайне “2 млн 200 тысяч чалавек – загінуў кожны чацвёрты жыхар рэспублікі” (Беларуская савецкая энцыклапедыя 1970). Этнічнасць ахвяраў не пазначалася. Насуперак лозунгу “Никто не забыт, и ничто не забыто” тое, што значную частку ахвяраў сярод грамадзянскага (цывільнага) насельніцтва складалі перадусім яўрэі, замоўчвалася.

[2] Аўтар выказвае падзяку сп. Уладзіміру Шчэрбаву за інфармацыю пра гэтую публікацыю.

Пытанне пра колькасць ахвяраў нацысцкай акупацыі застаецца дыскусійным у беларускай гістарыяграфіі (гл. аналіз розных ацэнак у: Литвин 2003). Дагэтуль невядома, колькі дакладна загінула мірнага насельніцтва. Пры гэтым ацэнкістратаў мірнага насельніцтва вагаюцца ад 1,4 мільёна да 750 тысячаў чалавек[3]. Таксама незразумела, якую дакладна долю людскіх стратаў Беларусі склалі знішчаныя падчас нацысцкага генацыду яўрэі і цыганы, забітыя і дэпартаваныя ў выніку сталінскага тэрору 1939–1941 гг. жыхары Заходняй Беларусі, памерлыя ў вайну ад хваробаў і старасці, нарэшце тыя, хто пакінуў краіну ў 1944 г. разам з нямецкім войскам у часе яго адступлення, у тым ліку калабаранты і добраахвотнікі.

## Мемарыяльная палітыка савецкага часу

За савецкім часам у БССР было створана пяць буйных мемарыялаў Другой сусветнай вайны нацыянальнага значэння:

- Манумент Перамогі ў Мінску (1954 г.)
- Дзяржаўны мемарыяльны комплекс “Хатынь” (1969 г.)
- Дзяржаўны мемарыяльны комплекс “Брэсцкая крэпасць-герой” (1969–1971 гг.)
- Курган Славы савецкай арміі вызваліцельніцы Беларусі (1969 г.)
- Дзяржаўны мемарыяльны комплекс “Прарыў” (1974 г.)

З пяці вышэйназваных мемарыяльных комплексаў ахвярам вайны з ліку грамадзянскага насельніцтва прысвечаны толькі адзін – “Хатынь”. Гэты мемарыял пабудаваны на месцы былой вёскі Лагойскага раёна Мінскай вобласці, насельніцтва якой было цалкам знішчана нацыстамі і іх памагатымі ў 1943 г. за нібыта дапамогу савецкім партызанам (Rudling 2012). Мемарыял “Хатынь” ствараўся ў часы кіраўніцтва Пятра Машэрава і мае адбіткі яго гістарычнай палітыкі.

Цэнтральнае месца мемарыяла займае “Плошча памяці”, на якой пасаджаны тры бярозы, якія сімвалізуюць жыццё, а на месцы чацвертай бярозы гарыць “полымя” (“вечный огонь”) – сімвал усіх загінулых у часе вайны. Побач з вогнішчам на мармуры зроблены тлумачальны надпіс: “2 мільёны 230 тысяч. Загінуў кожны чацверты”. Залітая ў камень статыстыка зрабіла магутны ўплыў на публічную памяць. Хатынь – найбуйнейшы ў СССР мемарыял памяці ахвяраў нацысцкай акупацыі – жыхароў знішчаных у антыпартызанскіх акцыях вёсак і вязняў лагераў смерці. Тэма яўрэйскага

[3] Гэтак, адзін з найбольш аўтарытэтных знаўцаў гісторыі нямецкага акупацыйнага рэжыму ў Беларусі Юры Туронак лічыць, што рэальная колькасць ахвяраў сярод мірнага насельніцтва склала 750 тысяч чалавек. Пры гэтым у савецкую статыстыку – 1,4 мільёна ахвяр – былі наўмысна ўлучаны ахвяры сталінскіх рэпрэсій 1937–1941 гг. (Туронак, 2008, 678–683).

і цыганскага генацыду ў Хатыні праігнараваная. Манапольнае месца ў савецкай палітыцы памяці ў Беларусі заняў гераічны партызанскі супраціў. Як адзначаў Віталь Сіліцкі,

> “Машэраў быў папулярнай і харызматычнай асобай, чалавекам, які сам быў партызанам, героем вайны, узнагароджаным зоркай Героя Савецкага Саюза ва ўзросце 26 гадоў. Ён да гэтага часу шануецца беларусамі за беспрэцэдэнтны эканамічны росквіт Беларусі ў часы Брэжнева. Гэта быў Машэраў, які ператварыў партызанскі супраціў у нацыянальны міф і зрабіў яго памятным знакам па якім Беларусь вызначалі і вызначаюць на прасторах былога Савецкага Саюза” (Silitski 2005).

**Генацыд і савецкая палітыка памяці**

Другая сусветная вайна стала найбуйнейшай катастрофай у жыцці насельніцтва Беларусі. Масавыя страты зазнала мірнае беларускае, польскае, рускае, украінскае, татарскае ды іншае насельніцтва рэспублікі. Дзве меншасці (яўрэі і цыганы) зазналі сістэматычнае фізічнае знішчэнне з боку нацыстаў. Трэба адзначыць, што масавае вынішчэнне яўрэяў і цыганоў, прызнанае міжнароднай супольнасцю як генацыд, адрозніваецца сваім характарам ад масавых забойстваў прадстаўнікоў іншых этнічных груп Беларусі. Паняцце “генацыд” мае акрэслены юрыдычны сэнс (Convention 1948). Ключавым для прававой ацэнкі характару масавых злачынстваў як генацыду з’яўляецца паняцце “намер” (intent). Як адзначае Ўільям Шабас, міжнароднае права трактуе розніцу паміж *“dolus generalis”* і *“dolus specialis”* у выпадках масавых злачынстваў супраць чалавецтва і сцвярджае, што генацыд не адбыўся, калі забойства асобных членаў адной групы не мела пад сабой канкрэтнага намеру знішчыць супольнасць як такую (Schabas 2000, 213–225).

Масавае забойства нацыстамі мірнага беларускага насельніцтва з’яўляецца злачынствам супраць чалавецтва, але не падпадае пад паняцце “генацыд”. Пакуль не знойдзена ніводнага дакумента, які б сведчыў пра планы татальнага знішчэння беларускага этнасу гітлераўскім рэжымам. Парадаксальна, але акупацыйны рэжым рабіў стаўку на беларускі нацыяналізм, і беларускія калабаранты мелі высокія шанцы выжывання. Ахвярамі нацыстаў станавіліся перадусім беларусы, якія бралі непасрэдны ўдзел у падпольным ці партызанскім руху ці падтрымлівалі партызанаў і падпольшчыкаў.

Тэрор супраць вясковага беларускага насельніцтва падчас антыпартызанскіх акцый, як і пакаранні смерцю падпольшчыкаў, не падпалі пад дзеянне

Канвенцыі аб папярэджанні злачынства генацыду і пакаранні за яго, бо былі абумоўленыя часовымі палітычнымі ці ваеннымі мэтамі нацысцкага рэжыму. Нават масавае знішчэнне нацыстамі ў 1944 г. мірнага беларускага насельніцтва пад Азарычамі дыктавалася намерам спыніць наступ Чырвонай арміі[4]. Нягледзячы на юрыдычную супярэчнасць, кваліфікацыя масавых злачынстваў нацыстаў супраць этнічна беларускага насельніцтва як “генацыду” папулярная, як пабачым далей, у дыскурсе сучаснай палітыкі памяці. Такім чынам дасягаецца фіксацыя калектыўнай траўмы вайны на тытульнай нацыі краіны.

Масавае забойства яўрэйскага і цыганскага насельніцтва мела выключны характар, бо знішчэнне гэтых народаў адбывалася з зафіксаванай у крыніцах канкрэтнай мэтай поўнага вынішчэння. Яўрэі не мелі шанцаў выжыць незалежна ад палітычных ды іншых перакананняў. Але выключны характар масавага знішчэння яўрэйскага і цыганскага насельніцтва савецкая дзяржава адмаўляла. Таму сотні месцаў масавага забойства нацыстамі яўрэйскага і цыганскага насельніцтва былі пазначаны ў Беларусі ў найлепшым разе сціплымі помнікамі. Замоўчваючы сапраўднае этнічнае паходжанне значнай часткі ахвяраў нацыстаў, улады ўжывалі створанае паняцце “мирные советские граждане”. Дагэтуль на постсавецкай прасторы размыта розніца паміж генацыдам і масавымі злачынствамі нацыстаў супраць славянскага насельніцтва.

У савецкі перыяд нацысцкая палітыка генацыду яўрэйскага і цыганскага этнасаў была прыглушана, вайна была вайной усяго савецкага народа – таму ахвярамі былі таксама прадстаўнікі адзінага савецкага народа – савецкія грамадзяне. Асноўным лейтматывам савецкай палітыкі памяці была гераізацыя вайны, якая для савецкага кіраўніцтва была бітвай герояў: салдатаў, партызанаў і падпольшчыкаў. Апрача генацыду яўрэяў і цыганоў да табу савецкай палітыкі памяці адносіліся пэўныя праблемныя моманты храналогіі і геаграфіі вайны, злачынствы савецкіх партызанаў, гісторыя несавецкага партызанскага (украінскага, польскага, беларускага) супраціву, масавая калабарацыя беларусаў з нацысцкім рэжымам. Другая сусветная вайна для значнай часткі савецкіх людзей пачалася ў 1941 г. Большасць беларусаў дагэтуль цьмяна ўяўляюць, што славутая Брэсцкая крэпасць зазнала дзве гераічныя

---

[4] На падставе нямецкіх архіваў гісторыкі Крыстаф Рас (Christoph Rass) і Рэнэ Роркамп (René Rohrkamp) у сваім новым праекце паказалі, што масавае знішчэнне праз заражэнне сыпным тыфам 50 тысячаў беларускага насельніцтва, сагнанага ў Азарыцкія лагеры смерці (Гомельская вобласць), з’яўлялася прадуманай і сістэматычнай акцыяй вермахта, дэталёва задакументаванай у крыніцах. Мэтай масавага забойства было спыненне за кошт жыццяў мірных людзей наступу Чырвонай арміі. Злачынная палітыка дасягнула сваёй мэты. У студзені 1944 г. на працягу тыдня жаўнеры савецкай 65-й арміі займаліся вывазам з Азарыцкіх лагераў 33 тысяч хворых і кволых людзей, з іх 15 960 былі дзецьмі (Катлярчук, 2012, 166–172). Беларускія публікацыі дакументаў па гэтай тэме: Озаричи – лагерь смерти. Документы и материалы. – Минск, 1999; Узники Озаричских лагерей вспоминают. – Минск, 1999.

абароны (у 1939 і 1941 гг.). У 1939 г. гэтую фартэцыю ад наступу нямецкай арміі абараняў польскі гарнізон (Marples and Rudling 2009). Такім чынам, савецкая таталітарная ўлада замоўчвала шэраг аспектаў гісторыі Другой сусветнай вайны.

## Яўрэйскі Галакост і палітыка памяці ў паваеннай Беларусі

Па дадзеных перапісу насельніцтва 1939 г., у савецкай Беларусі (да ўз'яднання з Заходняй Беларуссю) жыло 375,1 тысячы яўрэяў. Згодна з дадзенымі перапісу 1931 г. на заходнебеларускіх землях пражывала 283,3 тысячы грамадзянаў яўрэйскага паходжання (Розенблат и Еленская 2002). Такім чынам, на пачатак Другой сусветнай вайны ў БССР налічвалася каля 660 тысяч яўрэяў. Да гэтай лічбы ў 1939–1941 гг. дадаліся тысячы мігрантаў з нямецкай зоны акупацыі Польшчы. Агульная колькасць яўрэяў на абшарах БССР па стане на 1941 г. ацэньваецца ў 820 тысяч чалавек (Törnquist-Plewa 2006, 46). Абсалютная большасць беларускіх яўрэяў былі знішчаны нацыстамі ў часе першай (1941 г.) і другой (1942–1943 гг.) хваляў Галакосту. Да ўласна беларускіх ахвяраў генацыду яўрэяў трэба дадаць дзясяткі тысяч яўрэяў з Цэнтральнай і Заходняй Еўропы і савецкіх ваеннапалонных яўрэйскага паходжання, знішчаных на тэрыторыі акупаванай нацыстамі Беларусі. Выратаваліся тыя, хто пайшоў да партызанаў, або тыя, хто стаў у чэрвені 1941 г. бежанцам і не патрапіў у зону акупацыі[5]. Менавіта гэтыя людзі ды іх нашчадкі склалі на 1959 г. 150-тысячную яўрэйскую дыяспару Беларусі.

Ацэнкі замежных спецыялістаў адносна стаўлення этнічна беларускага насельніцтва да знішчэння нацыстамі яўрэяў кардынальна разыходзяцца (Катлярчук 2004 і 2007). Частка даводзіць унікальнае для Еўропы зычлівае стаўленне беларусаў да яўрэйскага насельніцтва (Epstein 2004). Як вядома, Беларусь займае 8-е месца ў свеце па колькасці людзей, якія ратавалі яўрэяў ды прызнаныя "праведнікамі сярод народаў свету" пасля Польшчы, Нідэрландаў, Францыі, Украіны, Бельгіі, Літвы і Венгрыі (Names and Numbers of Righteous Among the Nations 2012). Іншыя даследнікі кажуць пра актыўны і масавы характар удзелу беларускай калабарацыі ў Галакосце (Dean 2000, Rein 2011). У сучаснай беларускай гістарыяграфіі Галакост у Беларусі разглядаецца як злачынства нацыстаў, якое здзяйснялася з дапамогай латышскай, літоўскай і ўкраінскай паліцыі. Пытанне сувязі Галакосту з дзейнасцю беларускай калабарацыі ў навуковых публікацыях практычна не разглядаецца (Törnquist-Plewa 2006, 47–49).

[5] У лістападзе 1941 г. "Центральное справочное бюро СССР" зарэгістравала 222 тысячы яўрэйскіх бежанцаў з БССР (Смиловицкий 2010, 82).

Трэба адзначыць, што ў гады вайны і адразу пасля яе савецкія сродкі масавай інфармацыі не хавалі выключнага характару фізічнага вынішчэння нацыстамі яўрэйскай супольнасці (Беркхофф 2010). Узведзеныя адразу пасля вайны помнікі адкрыта падкрэслівалі этнічнасць ахвяраў сярод мірнага насельніцтва. Менавіта ў такой атмасферы ў 1947 г. быў пабудаваны ў Мінску помнік "Яма" – першы на абшарах СССР і адзіны помнік у сталіцах саюзных рэспублік, дзе было падкрэслена яўрэйскае паходжанне ахвяраў. Але гэтак званая "справа лекараў" ("дело врачей") ды наступная антысеміцкая кампанія ў СССР паклалі канец гэтай часовай з'яве. Ахвяры генацыду пераўтварыліся ў цьмяных "мірных грамадзянаў". Упартая барацьба яўрэйскага грамадства прывяла да часовай перамогі. На помніках, якія стаялі каля яўрэйскіх могілак, тэксты пра "мірных ахвяраў фашызму" дубляваліся на ідыш яўрэйскімі літарамі, якія не пакідалі сумневу ў этнічным паходжанні ахвяраў (Altshuler 2002). Так выглядае памятная дошка на месцы забойства яўрэяў Турава, дзе тэкст на рускай мове суправаждаецца тэкстам на ідыш.

Гісторыя і памяць пра Галакост была нязручнай для савецкага ўрада, таму што маглі стаць пунктам адліку фармавання моцнай яўрэйскай ідэнтычнасці. Гэтак, помнік "Яма" стаў месцам штогадовых памінальных мітынгаў мінскай яўрэйскай грамады, якія адбываліся 2 сакавіка і 9 мая. Савецкая ўлада рабіла націск на гераічныя аспекты вайны, маргіналізуючы трагедыю ахвяраў. Сітуацыю ў асяроддзі беларускіх яўрэяў (ды таксама, як пабачым далей, цыганоў і палякаў) у гэтыя часы можна акрэсліць як "індывідуальную сямейную памяць пра вайну без шанцаў на публічныя цырымоніі і грамадскае ўшанаванне".

На думку Іллі Альтмана, замоўчванне памяці Галакосту ў СССР было фактычна формай яго адмаўлення, бо грунтавалася на татальнай закрытасці архіўных крыніцаў і пакаранні тых, хто спрабаваў прарваць сцяну грамадскага маўчання (Альтман 2001, 473–474). Адыгрываў сваю ролю і знешнепалітычны фактар, а менавіта варожае стаўленне СССР да Ізраіля і ваеннапалітычнае супрацоўніцтва з арабскімі краінамі. У 1982 г. у Інстытуце ўсходазнаўства Акадэміі навук СССР, у якім кіраваў у той час акадэмік Яўген Прымакоў, была абаронена дысертацыя на суісканне навуковай ступені кандыдата гістарычных навук на тэму "Связи между сионизмом и нацизмом (1939–1945 гг.)". Аўтарам названай дысертацыі быў Махмуд Аббас – сучасны прэзідэнт Палесцінскай аўтаноміі.

Адным з інструментаў замоўчвання Галакосту з'яўлялася неабгрунтаванае атаясамленне сістэматычнага знішчэння яўрэйскага насельніцтва з масавымі забойствамі нацыстамі славянскага насельніцтва. Напрыклад, у часе выступлення ў 1965 г. на міжнароднай канферэнцыі ў Чэхаславакіі савецкія

гісторыкі Я. Болцін, Ф. Шаўчэнка і І. Краўчанка ўпэўнена сцвярджалі, што “прававы стан беларусаў у акупаваным нацыстамі Мінску мала адрозніваўся ад стану яўрэйскага насельніцтва горада” (Лейзеров 2006). Поспеху палітыкі замоўчвання Галакосту ў БССР замінала адна праблема – пасля вайны абшары Беларусі пераўтварыліся ў суцэльныя яўрэйскія брацкія могілкі (Левин 2010, 174). Менавіта таму адным з кірункаў савецкай мемарыяльнай палітыкі была адмова ад паказу паходжання ахвяраў брацкіх магіл і ад будавання манументаў Галакосту.

Пасля распаду СССР у Беларусі, як і ў іншых краінах СНД, разгарнуўся працэс, які можна акрэсліць паняццем “нацыяналізацыя памяці Другой сусветнай вайны”. Парады 9 мая ў Кіеве адкрываюць сцягі Першага і Другога Ўкраінскіх франтоў, у Мінску – штандары Першага, Другога і Трэцяга Беларускіх франтоў. І гэта нягледзячы на тое, што паняцце “ўкраінскі” ці “беларускі” фронт азначала кірунак удару і не мела аніякай нацыянальнай афарбоўкі. У сталіцы Ўзбекістана Ташкенце ў 2010 г. на месцы знішчанага ўладамі мемарыяла “советского солдата” пабудаваны новы мемарыял, прысвечаны узбекскаму жаўнеру (Мавлоний 2010)[6]. Ва Ўкраіне паўсталі шматлікія помнікі Ўкраінскай паўстанцкай арміі (УПА). У гарадах Расіі (Варонеж) усталяваны помнік “рускаму салдату Вялікай Айчыннай вайны”.

Праект дзяржаўнага будаўніцтва А. Лукашэнкі таксама ў значнай ступені грунтуецца на памяці Другой сусветнай вайны. Эксплуатацыя міфалогіі Другой сусветнай вайны мае, безумоўна, практычнае палітычнае значэнне для Лукашэнкі. Гэта не толькі падкрэслівае месца Лукашэнкі як апошняга абаронцы ў Еўропе савецкіх традыцый памяці, але таксама падтрымлівае міф аб усенароднай барацьбе беларускага народа з нямецка-фашысцкімі захопнікамі (Silitski 2005). Новы Дзень Незалежнасці (3 ліпеня), святкаванне 9 мая, шэраг новых мемарыялаў (“Лінія Сталіна”), супольныя блакбастары расійскага і беларускага кінематографа (“В августе 44”, “Брестская крепость”) – усё мае непасрэдную сувязь з падзеямі вайны. Як і ў савецкі час, у Беларусі працягваюць будавацца буйныя мемарыялы героям вайны. У 1995 г. быў адкрыты прысвечаны абароне Магілёва мемарыял “Буйніцкае поле”. У 2005 г. запрацаваў гістарычна-культурны комплекс “Лінія Сталіна”, які ўзнік на месцы сістэмы абарончых збудаванняў, узведзеных каля Мінска ўздоўж заходняй мяжы СССР у 1939 г. Мемарыял “Лінія Сталіна” быў створаны да 60-годдзя перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне пры падтрымцы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнкі і фінансаванні дабрачыннага фонду ветэранаў вайны ў Афганістане “Памяць Афгана”. У 2004 г. паводле ўказа Прэзідэнта Рэспублікі

[6] У адрозненне ад пераносу на новае месца (не-разбурэння!) помніка “Бронзавага салдата” ў Таліне ў 2007 г., падзея ў Ташкенце не выклікала рэзанансу ў беларускіх СМІ. Магчыма, з прычыны лагодных дачыненняў Мінска з рэжымам Карымава.

Беларусь быў адрэстаўраваны мемарыяльны комплекс “Хатынь”, пры гэтым Аляксандр Лукашэнка ўзяў удзел у “суботніку” па ўпарадкаванні мемарыяла.

Як адзначае Андрый Партноў, асноўнай стратэгіяй інтэграцыі памяці вайны ў новую постсавецкую схему стала яе “гуманізацыя”, гэта значыць пераключэнне палітыкі памяці з герояў на пакуты звычайных людзей (Портнов 2007). Таму ў сучаснай Беларусі паўсталі і новыя помнікі ахвярам вайны. У 2007 г. у вёсцы Красны Бераг Гомельскай вобласці быў адкрыты дзяржаўны мемарыяльны комплекс, прысвечаны дзецям, якія загінулі ў гады вайны. Гэты мемарыял у Беларусі атрымаў неафіцыйную назву “Дзіцячая Хатынь”. Тут у 1942–1943 гг. размяшчаўся адзін з перасыльных лагераў для адпраўкі моладзі ў Германію.

Паводле сведкаў, у названым лагеры ўтрымліваліся дзеці, у якіх, між іншым, забіралі кроў для нацысцкіх салдатаў. Мемарыял быў спраектаваны творчай групай пад кіраўніцтвам заслужанага архітэктара Беларусі Л. М. Левіна – аўтара савецкага мемарыяла “Хатынь”. Красны Бераг – найбуйнейшы ў свеце мемарыял, прысвечаны дзецям – ахвярам Другой сусветнай вайны.

Ад 1991 года ў Беларусі назапашана сур’ёзная гістарыяграфія па вывучэнні Галакосту, разгледжаны розныя аспекты гэтай трагедыі[7]. Але мемарыяльная палітыка ўрада застаецца па-за ўвагай даследнікаў[8]. На нашу думку, пераасэнсаванне савецкай міфалогіі вайны стварыла шанцы на ўлучэнне калектыўнай траўмы яўрэйскага народа ў публічную сферу беларускай палітыкі. За часы прэзідэнцтва А. Лукашэнкі ў Беларусі ўзніклі дзясяткі новых “несавецкіх” помнікаў, прысвечаных генацыду яўрэйскага народа. Сярод іх новы мемарыял “Яма” (2000 г.), помнік нямецкім (2008 г.) і аўстрыйскім яўрэям – ахвярам Галакосту (2009 г.) у Мінску, помнікі ў Валожыне, Віцебску, Бабруйску, Барысаве, Баранавічах, Брэсце, Друі, Магілёве, Глуску, Нясвіжы, Пінску. У адрозненне ад савецкага часу на ўсіх помніках было падкрэслена яўрэйскае паходжанне ахвяраў. Як паведамляе грамадская “Камісія па ўвекавечанні памяці ахвяраў Галакосту”, за апошнія 5 гадоў пры падтрымцы дзяржавы ў Беларусі ўсталявана 45 новых помнікаў ахвярам генацыду (Шоўкун 2010). У адпаведнасці з рашэннем Мінгарвыканкама ў сталіцы плануецца ўзвядзенне мемарыяльнага комплекса на месцы былога лагера Трасцянец – найбуйнейшага лагера смерці на тэрыторыі СССР і чацвертага ў Еўропе па колькасці ахвяраў Галакосту.

У 2008 г. на вышэйшым узроўні было адзначана 65-годдзе ліквідацыі Мінскага гета (Басин 2009). Быў створаны дзяржаўны аргкамітэт па ўве-

---

[7] Гл. агляд беларускіх працаў па гісторыі Галакосту: Розенблат 2003.

[8] Хіба можна прыгадаць працу М. Б. Батвінніка, якая, на жаль, мае выключна даведкавы характар: Ботвинник 2000

кавечанні памяці Мінскага гета, які ўзначаліў упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леанід Гуляка. Міністр абароны Леанід Мальцаў ад імя прэзідэнта ўзнагародзіў за мужнасць і гераізм удзельнікаў супраціву ў Мінскім гета медалём “60 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне”. 20 кастрычніка 2008 г. у прысутнасці прадстаўнікоў яўрэйскай грамады і дыпламатычнага корпуса сталічны мемарыял “Яма” ўпершыню наведаў А. Лукашэнка (Лашкевич 2008). У добра падрыхтаванай прамове прэзідэнт краіны згадаў асноўныя падзеі трагедыі яўрэйскага народа, дапамогу з боку беларускага насельніцтва, пацвердзіў абяцанне ўрада па пабудове мемарыяльнага комплекса на месцы былога лагера смерці Трасцянец (Пресс-служба Президента Республики Беларусь 2008).

Паступова змяняецца і змест экспазіцый беларускіх музеяў. Напрыклад, знакаміты музей Брэсцкай крэпасці мае цяпер інфармацыю, прысвечаную Галакосту і ліквідацыі Брэсцкага гета (Ganzer and Paskovic 2010, 94). Прычыны кардынальных зменаў у гістарычнай палітыцы Беларусі датычна Другой сусветнай вайны не паддаюцца выразнаму паліталагічнаму аналізу, бо ліберальная паводле кірунку палітыка памяці праводзіцца пад кіраўніцтвам аўтарытарнага рэжыму[9]. Падтрымка дзяржавай праекту па ўшанаванні памяці Галакосту, безумоўна, мае станоўчы характар, бо спрыяе цярпімасці і павазе да нацыянальных меншасцяў сярод большасці беларускага насельніцтва. Думка некаторых беларускіх даследнікаў аб закансерваванні і ў Беларусі “савецкага” канону памяці падаецца памылковай (Ластовский 2009). Мазырскі выпадак 2003 г., калі мясцовыя ўлады ў савецкім духу адрэдагавалі надпіс на помніку, які меў увекавечыць памяць беларускіх яўрэяў, з’яўляецца выключэннем. Зрэшты, неўзабаве пра помнік з’явіліся аб’ектыўныя звесткі[10].

Адначасова працягваецца запачаткаваная ў савецкім часе навукова не абгрунтаваная традыцыя адаптацыі паняцця генацыд пад масавае знішчэнне нацыстамі ўласна беларускага насельніцтва. Ва ўрачыстай прамове да 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нацыстаў прэзідэнта Лукашэнкі зноў загучаў тэзіс пра генацыд беларусаў:

> “Но гитлеровская оккупация была явлением особого рода: немецкие фашисты ставили цель истребить белорусский народ.

---

[9] Паводле размовы аўтара артыкула з Андрэем Уманскім (Andrej Umansky) падчас навуковага сімпозіума “Nazi Camps in the Occupied Soviet Territories”. United States Holocaust Memorial Museum, Yahad–In Unum and the Université Paris-IV Sorbonne University. Парыж, 20 верасня 2011 г.

[10] У жніўні 1941 г. больш за 20 яўрэяў Мазыра здзейснілі акт самаспалення на знак пратэсту супраць нацысцкага генацыду. У 2003 годзе ім з ініцыятывы замежных яўрэйскіх арганізацый быў пастаўлены помнік. Але мясцовыя ўлады прыбралі памятны знак, які, маўляў, “быў пастаўлены без узгаднення”. У 2010 г. улады аднавілі помнік, зрабіўшы гэта, аднак, спецыфічным чынам: замест надпісу пра беларускіх яўрэяў з’явілася згадка пра ўчынак “мірных жыхароў Мазыра”. Гл. падрабязней: Браточкин 2012.

> На "очищенном" таким образом жизненном пространстве Берлин планировал оставить в живых только четвертую часть нас, белорусов. В качестве рабов. За три года оккупации гитлеровцы с циничной методичностью уничтожали наших людей. Расстреливали, сжигали заживо не только тех, кто брал в руки оружие, но и детей, женщин и стариков" (Лукашенко 2004).

Паняццем "генацыд" акрэслена масавае знішчэнне этнічна беларускага насельніцтва на афіцыйнай старонцы дзяржаўнага мемарыяла "Хатынь"[11].

З'явіліся таксама новыя падыходы да падліку ахвяраў. Завочная канкурэнцыя Лукашэнкі з найбольш папулярным беларускім палітыкам савецкіх часоў Машэравым адбілася не толькі ў змене назвы аднаго з цэнтральных праспектаў сталіцы (праспект Машэрава стаў праспектам Пераможцаў), але і ў мемарыяльнай палітыцы. Паводле словаў Лукашэнкі, у Другой сусветнай вайне загінуў "кожны трэці жыхар рэспублікі" (Лукашенко 2004). Нягледзячы на адсутнасць навуковай глебы для падобных падлікаў, менавіта гэтая лічба робіцца кананічнай у сучаснай Беларусі.

Адзначым, што працэс мемарыялізацыі Галакосту ідзе паралельна з імклівым змяншэннем колькасці яўрэйскай дыяспары. Калі ў 1989 г. у Беларусі жыло каля 112 тысяч яўрэяў, то праз 10 гадоў у Беларусі засталося толькі 27 тысяч. За дзесяць апошніх гадоў колькасць яўрэйскага насельніцтва зменшылася на 56 % і склала 12 тысяч чалавек на 2009 г. (Перепись 2011). Гэта стварае сур'ёзныя перашкоды для будучай мемарыяльнай працы, бо мясцовыя яўрэйскія грамады з'яўляюцца актыўнымі актарамі памяці[12]. Варта адзначыць, што імклівая мемарыялізацыя памяці яўрэйскага генацыду пацвярджае высновы замежных аўтараў пра тое, што ў гістарычнай палітыцы сучаснай Беларусі адбываецца перагрупоўка савецкай гісторыі вакол новых наратыўных восяў (Ушакин 2001, 231).

## Цыганы Беларусі і памяць пра генацыд

Пры правядзенні перапісу 1939 г. у савецкай Беларусі налічылі 3632 цыганоў (Перепись 2011). У той самы час у міжваеннай Польшчы жыло каля 30 тысячаў цыганоў (Ficowski 1989). Колькі з іх вандравала па ўсходніх "беларускіх" ваяводствах польскай дзяржавы – невядома. Перапіс 1959 г. паказаў 4662 цыганоў у БССР. Цыганскі журналіст Вальдэмар Калінін лічыць, што каля 40 % даваеннага цыганскага насельніцтва Беларусі было

---

[11] Дзяржаўны Мемарыяльны комплекс Хатынь. Афіцыйная старонка: http://khatyn.by/by/.

[12] Напрыклад, новы помнік ахвярам Галакосту ў Глуску быў пабудаваны з ініцыятывы і на сродкі апошняй яўрэйскай сям'і, што жыве ў гэтым горадзе. Гл.: Jewish.Ru 2010.

знішчана нацыстамі ды іх пасобнікамі (Калинин 2005, 100). Нямецкі гісторык Хрысціян Герлах піша пра 3000 ахвяраў нацысцкага генацыду цыганоў у Беларусі (Gerlach 1999, 1063).

У 1944 г. цэнтральныя савецкія газеты падкрэслівалі, што ў выпадку знішчэння цыганоў нацысты кіраваліся выключна расавымі перакананнямі: *"их расстреляли только за то, что они были цыганы"* (Сообщение 1944). Аднак пасля перамогі сістэматычнае знішчэнне нацыстамі цыганскага насельніцтва зрабілася табу ды ігнаравалася савецкай гістарычнай навукай і палітыкай. Успаміны пра генацыд захоўваліся збольшага ў вуснай форме ў асяроддзі саміх цыганоў (Stewart 2004).

Недахоп адукаваных прадстаўнікоў народа зрабіў немагчымым у свой час запіс і распаўсюджванне сведчанняў цыганскай трагедыі. Аднавіць спіс ахвяраў у наш час бадай немагчыма, бо сышлі з жыцця апошнія сведкі той трагедыі. Вядомая толькі адзіная ініцыятыва савецкага часу па збудаванні помніка ў цыганскай вёсцы Аляксандраўка блізу Смаленска. У 1968 г. артысты маскоўскага дзяржаўнага цыганскага тэатра "Рамэн" звярнуліся ў Смаленскі аблвыканкам з просьбай дазволіць збудаванне помніка на месцы масавага расстрэлу 24 красавіка 1942 г. 176 аседлых беларускіх цыганоў. Група маскоўскай інтэлігенцыі, сярод якой былі вядомы цыганскі артыст Мікалай Слічэнка (бацька і сваякі якога загінулі ў часе вайны ў Харкаве), актор В. П. Яфрэмаў, гітарыст Ф. Кандэнка, вядомы перакладнік Л. Гінзбург, распачалі акцыю. Яны сустракаліся з сведкамі, збіралі сведчанні гэтай трагедыі, прапаноўвалі ўсталяваць помнік за ўласны кошт. Аднак улада не саступіла. Толькі з пачаткам перабудовы ў 1985 г. па матывах смаленскага расстрэлу тэатрам "Рамэн" быў пастаўлены спектакль "Птушкам трэба неба" (Holler 2008, 263–279). Нарэшце, у 1991 г. за колькі месяцаў да распаду СССР над брацкай магілай на Смаленшчыне быў усталяваны манумент. Аднак *этнічнасць ахвяраў не называлася*. Тэкст помніка паведамляе: "Здесь захоронено 176 мирных жителей д. Александровки, расстрелянных немецко-фашистскими захватчиками 24 апреля 1942 г."

Звесткі пра генацыд цыганоў у беларускай гістарыяграфіі маюць фрагментарны характар. У суседняй Украіне за апошнія гады прайшло некалькі канферэнцый па гісторыі генацыду цыганоў, выдадзены зборнікі, падрыхтаваны навуковыя кадры[13]. Тым часам у Беларусі няма ніводнага навукоўца, які б адмыслова займаўся гэтай тэматыкай. Колькасць жа навуковых публікацый зводзіцца да адзінага артыкула, які быў падрыхтаваны

[13] Гл., напрыклад: Історичний та етнокультурний розвиток циган (рома) України (XVI–XX ст.) 2006; Адам, Зейкан, Навроцька 2006; Зіневич 2008; Солонарь 2008; Тяглый 2007; Тэматычны нумар часопіса Голокост і сучасність 2009.

Аляксандрам Фрыдманам (Фрыдман 2004). Мабыць, таму артыкул “Цыганы” ў Энцыклапедыі гісторыі Беларусі абмяжоўваецца кароткай згадкай пра знішчэнне цыганоў, а спецыяльныя акадэмічныя працы па гісторыі беларускіх цыганоў увогуле не згадваюць пра трагедыю цыганскага народа (Карашчанка 1998, Дучыц 2003). Як справядліва адзначае Міхаіл Цяглы, масавае знішчэнне цыганоў дагэтуль лічыцца постсавецкімі даследнікамі “другаразрадным генацыдам” і знаходзіцца на перыферыі гістарычных даследаванняў (Тяглий 2011).

Адначасова за апошнія гады ва Ўкраіне паўстала каля 20 мемарыялаў, якія прысвечаны памяці ахвяраў цыганскага генацыду. Паводле рашэння парламента Ўкраіны ад 8 кастрычніка 2004 г. у адпаведнасці з рашэннем Рады Еўропы штогод 2 жніўня на дзяржаўным узроўні адбываецца ўшанаванне “Міжнароднего дня Голокосту ромів”. Услед за краінамі Еўрапейскага саюза Ўкраіна адмовілася ад слова “цыганы” на карысць больш палітычна карэктнай назвы – “ромы”. Тым часам беларуская ўлада на апошнія тэндэнцыі *ў еўрапейскай палітыцы* не рэагуе. У пэўных беларускіх сродках масавай інфармацыі цыганская меншасць асацыюецца са злачыннасцю, што ператварае яе ў маргінальнаю групу грамадства[14].

Апроч гэтага, мемарыялізацыя памяці ахвяраў нацысцкага генацыду цыганоў мае шэраг аб’ектыўных перашкодаў, звязаных з рашэннямі, якія былі прыняты ў савецкі перыяд. Фактычная забарона на памяць і слабая інтэграцыя ў савецкае грамадства не пакідалі цыганам шанцаў на публічнае прызнанне іх трагедыі ў СССР. Вялікая савецкая энцыклапедыя сцісла паведамляла сваім чытачам, што “ў гады Другой сусветнай вайны 1939–45 гг. каля 20 тыс. цыганоў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы былі па-варварску знішчаныя гітлераўцамі” (Венцель 1978). Як бачым, згодна з савецкай энцыклапедыяй да СССР факт генацыду цыганоў нібыта не меў ніякага дачынення. У выніку на 1991 г. на тэрыторыі Беларусі не было ніводнага помніка генацыду цыганоў з указаннем (або нават намёкам) на этнічнай прыналежнасці.

Адной з галоўных праблем сучаснай палітыкі памяці з’яўляецца дэперсаніфікацыя ахвяраў цыганскага генацыду. Дакладная колькасць цыганоў Беларусі таго часу не паддаецца падліку. Цыганы традыцыйна пазбягаюць кантактаў з уладамі, таму дадзеныя афіцыйных перапісаў і рэальная колькасць цыганоў могуць адрозніваццa ў разы. Савецкі перапіс 1939 г. не ўлічваў цыганскага насельніцтва Заходняй Беларусі, што ўвайшла ў склад СССР у канцы 1939 г. Як вядома, гэтая тэрыторыя з XVI ст. з’яўляецца традыцыйнай

[14] Напрыклад, з’яўляюцца арыенціроўкі беларускай міліцыі з падзелам злачынцаў на асобаў “цыганскай нацыянальнасці”. Гл.: Ушацкая міліцыя палюе на цыганоў 2011; Милиция не видит разницы между цыганами и преступниками? 2012.

вобласцю рассялення цыганоў. Апошні передваенны польскі перапіс 1931 г. увогуле не ўлічваў цыганоў як асобную катэгорыю насельніцтва. Такім чынам, колькасць цыганоў, якія знаходзіліся ўлетку 1941 г. на абшарах сучаснай Беларусі, не паддаецца нават прыблізнаму ўліку.

Адзначым таксама, што большасць цыганоў да вайны вялі вандроўны лад жыцця, як правіла, не мелі пашпартоў, пазбягаючы любых кантактаў з уладай. Паселішчы аседлых цыганоў былі раскіданы драбнюсенькімі выспачкамі па ўсёй тэрыторыі рэспублікі, нідзе не складаючы значных груп (Гарэцкі 1929). Некаторая частка вандроўных цыганоў пад савецкім ціскам вымушана была перайсці да земляробства. Так, у 1927 г. у Віцебскім раёне быў створаны першы ў СССР цыганскі калгас “Новае жыццё” (Дучыц 2003). Не варта забываць, што Беларусь была таксама традыцыйным месцам летніх вандровак цыганоў Малдавіі і Расіі. Таму рэальная колькасць ахвяраў нацысцкага генацыду цыганоў на тэрыторыі Беларусі можа быць значна вышэйшая за лічбы, адлюстраваныя ў дадзеных перапісаў. Застаецца канстатаваць, што нам невядома, калі і якіх канкрэтна цыганоў забілі нацысты ў Беларусі ў 1941–1944 гг.

Даследнікі цыганскага генацыду справядліва адзначаюць, што колькасць забітых вандроўных цыганоў і месцы іх расстрэлаў застаюцца невядомыя. Часта адзінымі сведкамі злачынстваў былі самі забойцы (Деметр, Бессонов и Кутенков 2000, 217). Напрыклад, у снежні 1966 г. Упраўленнем Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Гомельскай вобласці былі арыштаваныя былыя супрацоўнікі 724-га аддзела таемнай палявой паліцыі (Gruppe Geheime Feldpolizei 724), у тым ліку Сцяпан Кузняцоў, былы савецкі ваеннапалонны. Група дзейнічала ў тылавой зоне групы армій “Цэнтр” – гэта значыць на тэрыторыі ўсходняй часткі сучаснай Беларусі. У часе дазнання арыштаваныя памагатыя акупантаў паказалі невядомае месца расстрэлу цыганскага табара ў лесе паблізу вёскі Слабодка Віцебскай вобласці. Згодна з матэрыяламі следства, праведзенага КДБ, знішчэнне цыганскага табара адбылося наступным чынам:

> “Улетку 1942 года, вяртаючыся з задання па пошуку партызан і рэквізіцыі ў насельніцтва прадуктаў харчавання, паліцаі на чале з фельдфебелем Функам заўважылі ў лесе на беразе невялікай рачулкі паблізу паселішча Ізба цыганскі табар і акружылі яго. Не адчуваючы небяспекі, цыганы сядзелі спакойна вакол вогнішча, гатавалі ежу і мірна гутарылі, непадалёку пасвіліся коні… На наступны дзень цыганоў даставілі ў Чашнікі і трымалі ў камерах да вечара, калі на банкеце ў будынку штаба паліцыі іх прымусілі іграць на гітарах, спяваць і танчыць, пасля чаго п’яныя паліцаі сарвалі з цыганак упрыгожанні і зноў змясцілі ў

> камеры. Уранку супрацоўнікі паліцыі вывелі цыганоў за вёску Слабада да лесу каля ракі Ула, дзе на ўзвышшы загадзя была падрыхтавана яма. Там яны бязлітасна расстралялі ўвесь табар разам з малымі дзецьмі. Цыганкі перад расстрэлам галасілі і пагражалі паліцэйскім жахлівай божай карай, мужчыны моўчкі стаялі, спрабуючы абараніць дзяцей…” (Бачурин 2013).

Адзначым шэраг іншых момантаў, якія адрозніваюць мемарыяльную працу па ўшанаванні памяці яўрэйскай і цыганскай трагедыі. У адрозненне ад яўрэяў, у цыганоў практычна не было ўласнага гістарычна-культурнага ландшафту. Калі сёння пра Галакост яўрэяў нагадваюць не толькі помнікі, але і спусцелыя сінагогі, яўрэйскія кварталы, могілкі, цыганы гэтага пазбаўленыя. З генацыдам цыганоў была знішчана амаль уся фізічная прастора памяці.

Беларускія цыганы маюць тыповыя для навакольнага насельніцтва імёны і прозвішчы (беларускія, польскія). Асаблівасці антрапанімікі маюць важнае значэнне. Калі акты “Чрезвычайной Государственной Комиссии по установлению и расследованию злодеяний немецко-фашистских захватчиков и их сообщников” (ЧГК) не згадваюць наўпрост пра этнічнасць ахвяраў, высветліць яўрэйскае паходжанне ахвяраў часам магчыма прааналізаваўшы імёны. Высветліць пры гэтым цыганскае паходжанне ахвяраў немагчыма. У большасці выпадкаў беларускія цыганы расстрэльваліся на месцах, абраных нацыстамі для знішчэння яўрэйскага насельніцтва, ваеннапалонных, партызанаў і падпольшчыкаў. Такія месцы, як правіла, улічваліся ЧГК і адзначаліся савецкімі памятнымі знакамі з абстрактнай формулай абазначэння ахвяраў – “савецкія мірныя грамадзяне”. Нягледзячы на недахопы, сама ўстаноўка помніка стварала такія ўмовы для аховы брацкага пахавання ад вандалізму.

У адрозненне ад беларускіх яўрэяў, цыганы не з’яўляюцца гамагеннай этнічнай групай. Цыганская супольнасць Беларусі падзелена на шэраг дыялектных і субкультурных груп, сярод якіх: беларуска рома, ліпенцы, бежанцы, пінчукі, польска рома-фэлдытка, сякі, муканы, бернікі ды іншыя. Розныя групы цыганскага этнасу вызнаюць праваслаўе, каталіцызм, пратэстанцтва. Як вынік дачыненні паміж living групамі не заўсёды блізкія. Адсюль некалькі важных высноў. Часта непасрэдная эмацыйная (спадчынная) сувязь паміж ахвярамі масавых рэпрэсій, якія пахаваны ў пэўным месце, і лакальнай цыганскай суполкай адсутнічае. Менавіта так, напрыклад, адбылося ў г. Тураве. У гады вайны паблізу места ва ўрочышчы “Казаргаць” была расстраляная невядомая група цыганоў.

Сучасная цыганская грамада прадстаўлена цыганамі – нашчадкамі перасяленцаў канца 1950-х гг., якія аселі ў гэтым палескім горадзе пасля пастано-

вы савецкага ўрада аб аседласці 1956 г.[15] Цыганы Турава ведаюць пра масавае знішчэнне сваіх продкаў нацыстамі, але нічога канкрэтнага – пра мясцовае тураўскае пахаванне[16]. Такая сітуацыя з'яўляецца тыповай. Дэперсаніфікацыя ахвяраў разам з недахопам адукаваных кадраў і навуковых цэнтраў азначае, што самі цыганы бадай не ў стане выступаць актыўнымі агентамі памяці. У адрозненне ад яўрэйскай грамады, пошук масавых пахаванняў цыганоў і ініцыятыва ўсталявання помнікаў сыходзіць у Беларусі ў асноўным ад дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый, удзельнікі якіх не з'яўляюцца этнічнымі цыганамі.

Нягледзячы на пералічаныя праблемы, палітыка памяці генацыду цыганоў у Беларусі не выглядае правальнай. У параўнанні з Расійскай Федэрацыяй, дзе дагэтуль няма ніводнага помніка ахвярам нацысцкага генацыду цыганоў, у Беларусі за апошнія гады паўстала тры помнікі, прысвечаныя трагедыі цыганскай супольнасці ў часе Другой сусветнай вайны. Помнік у Пінску згадвае цыганоў разам з яўрэямі ды іншымі ахвярамі нацызму. Помнік каля вёскі Гарадзішча Баранавіцкага раёна, афармлены ў цыганскім стылі, мае эмацыйны надпіс на цыганскай і беларускай мовах: "Тут пахаваны нашы браты цыганы, расстраляныя фашыстамі летам 1941 г.". Урэшце, у 2008 г. ахвяры цыганскага генацыду былі адмыслова ўшанаваныя ў помніках Калдычаўскага мемарыяла.

Ёсць меркаванне, што ва ўмовах адсутнасці краіны, сваёй тэрыторыі, адзінай мовы, культуры і рэлігіі менавіта агульная памяць пра генацыд аб'ядноўвае розныя групы цыганоў і мабілізуе іх нацыянальны рух. Як адзначае польскі сацыёлаг Славамір Капральскі,

> Памяць пра цыганскі Галакост ужо стала галоўным элементам ідэнтычнасці цыганоў і падставай іх гістарычнай памяці. Праз рытуалы памяці цыганы засяроджваюцца на трагедыі мінулага, каб будаваць лепшую будучыню (Kapralski 2012, 77).

Актыўная палітыка памяці – аптымальны шлях пераадолення ізаляцыі цыганоў і інтэграцыі гэтага шматпакутнага этнасу ў беларускую нацыю. Цікавая ініцыятыва "Саюза беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і абшчын" усталяваць у Мінску помнік цыганам, што загінулі ў гады Другой сусветнай вайны (Помнік загінулым у гады вайны цыганам усталююць у Мінску 2010). Тры помнікі, якія былі пастаўлены за апошнія

[15] 5 кастрычніка 1956 г. быў выдадзены Ўказ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР "Аб далучэнні да працы цыганоў, якія займаюцца бадзяжніцтвам", які прадугледжваў крымінальнае пакаранне за працяг вандровак. Міліцыя абавязана была спыняць і ставіць на рэгістрацыйны ўлік (прапіску) усіх табарных цыганоў. Мясцовыя органы ўлады павінны былі спрыяць у даванні цыганам жытла і працы.

[16] Паводле матэрыялаў палявых даследаванняў аўтара 2011 г. Тураў. Архіў аўтара.

гады, на дзясяткі месцаў масавага забойства беларускіх цыганоў – занадта мала. Шэраг брацкіх магіл цыганоў застаюцца без апазнавальных знакаў і разбураюцца.

**Польскія ахвяры вайны і палітыка памяці**

Другая сусветная вайна стала найбуйнейшай катастрофай у гісторыі польскага насельніцтва Беларусі[17]. У міжваеннай польскай дзяржаве праводзілася нацыянальная палітыка дыскрымінацыі беларускай меншасці (Lubachko 1972). Як адзначыў Мікалай Вакар, “Другая сусветная вайна заспела заходніх беларусаў падзеленых паміж камунізмам і нацыяналізмам, – але ніводзін з іх не пакутаваў на лаяльнасць да польскай дзяржавы” (Vakar 1956, 136). У выніку гітлераўскай і сталінскай агрэсіі 1939 г. палякі страцілі ўласную дзяржаву ды перайшлі з тытульнай нацыі ІІ Рэчы Паспалітай у разрад стыгматызаванай меншасці Савецкага Саюза і Трэцяга райху. Менавіта этнічныя палякі, якія знаходзіліся ў Заходняй Беларусі на вышэйшай прыступцы іерархічнай лесвіцы грамадства (палякамі вызначалі сябе большасцьураднікаў, вайскоўцаў, асаднікаў і нашчадкаў шляхты), сталі галоўнай мішэнню савецкіх рэпрэсій у БССР у 1939–1941 гг. (Грыбоўскі 2007).

Як адзначаюць беларускія і замежныя гісторыкі, даваенная напружанасць справакавала ў гады нямецкай акупацыі на землях Заходняй Беларусі грамадскі канфлікт паміж беларусамі і палякамі. Канфлікт, які паступова набываў рысы вайны грамадзянскай (Туронак 1993, К’яры 2005, Крывашэй 2005, Грыбоўскі 2006, Rein 2011). Аддзелы Арміі Краёвай (АК), якія змагаліся ў Беларусі супраць нацыстаў за аднаўленне польскай дзяржавы, знішчалі беларускіх актывістаў. Нацысцкая адміністрацыя ў Генеральнай акрузе Беларутэнія рабіла стаўку на беларускі нацыяналізм, а беларускія калабаранты рукамі немцаў або пры непасрэдным удзеле мясцовай дапаможнай паліцыі забівалі польскіх партызанаў, актывістаў і ксяндзоў. Пасля адкрыцця праўды пра Катынскі расстрэл і разрыву дачыненняў паміж польскім урадам на выгнанні і сталінскім кіраўніцтвам, з 1943 г., Армія Краёва перайшла ў стан ворагаў СССР. На загад першага сакратара ЦК КП(б)Б і начальніка Цэнтральнага штаба партызанскага руху пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандавання Панцеляймона Кандратавіча Панамарэнкі ўсе савецкія партызаны мусілі змагацца з польскай АК.

[17] Тут і далей пад палякамі аўтар разумее людзей, што падчас шматлікіх перапісаў і ў штодзённым жыцці паслядоўна падкрэсліваюць сваю польскую этнічнасць. Як вядома, значная частка беларускіх палякаў не валодае ў дастатковай ступені літаратурнай мовай і ёсць нашчадкамі аўтахтоннага каталіцкага насельніцтва Беларусі.

Пасля вайны беларускія палякі, нягледзячы на змаганне з нацызмам, апынуліся па-за межамі ўласнай дзяржавы. 6 ліпеня 1945 г. паміж Часовым урадам нацыянальнага адзінства Польшчы і ўрадам СССР было заключана пагадненне пра абмен насельніцтвам: асобы польскай і яўрэйскай нацыянальнасцяў, якія былі грамадзянамі даваеннай Польшчы і жылі ў СССР, атрымалі права на выезд у Польшчу, а асобы рускай, беларускай, украінскай, русінскай і літоўскай нацыянальнасцяў, якія жылі на тэрыторыі Польшчы, былі абавязаны перасяліцца ў СССР. На 31 кастрычніка 1946 г. з Польшчы ў СССР перасялілася каля 518 тысяч чалавек, а з СССР у Польшчу – каля 1090 тысяч чалавек (па іншых дадзеных – 1526 тысяч чалавек). Такім чынам, толькі з савецкай Беларусі ў Польшчу эміґравалі ў 1944–1959 гг. каля 275 тысяч палякаў (Czerniakiewicz 2004). Нават пасля масавага перасялення палякі засталіся найбуйнейшай пасля рускіх этнічнай меншасцю БССР (538,8 тысячы згодна з дадзенымі перапісу 1959 г.). Але ў адрозненне ад 600 тысяч рускіх грамадзян БССР палякі жылі кампактна на акрэсленай тэрыторыі Гродзенскай, Брэсцкай, Віцебскай ды Мінскай абласцей ды мелі культурныя і рэлігійныя інстытуты, што існавалі ў даваенны перыяд.

У паваеннай Беларускай ССР адбывалася дыскрымінацыя польскага насельніцтва. Палякі і немцы былі адзінымі буйнымі народамі СССР, якія не атрымалі ўласнай аўтаноміі, прытым што савецкія палякі жылі кампактна на абшарах заходняй Беларусі і паўночна-ўсходняй Літвы. Больш за тое, у той час як у Савецкай Літве палякі мелі магчымасць развіваць сістэму адукацыі, у тым ліку школы і культурныя асяродкі, у Савецкай Беларусі такія магчымасці былі зачынены. Фактычна спынілі сваё існаванне ў Беларусі інстытуцыялізаваныя формы жыцця рыма-каталіцкага касцёла. Быў абмежаваны рынак польскіх газет і кніг. У выніку рэалізацыі савецкага асіміляцыйнага праекта палякі з нацыі, што мела моцную адукаваную эліту ў межах Беларусі,ператварыліся збольшага ў сялянскую меншасць БССР, якая не валодала літаратурнай роднай мовай. Усе публічныя польскія цырымоніі памяці, як святкаванне Дня Канстытуцыі 3 мая або Дзень незалежнасці 11 лістапада, былі табуяваны. У жорсткіх умовах памяць беларускіх палякаў пра мінулае не выходзіла па-за сямейныя межы. Да 1991 г. у Беларусі не было ніводнага мемарыяла польскім ахвярам Другой сусветнай вайны. Савецкая ўлада выдатна разумела, што месца памяці можа стаць месцам непажаданай мабілізацыі польскага руху.

Сітуацыя пачала змяняцца ў 1990-х гг. Важнасць пытання палягала ў тым, што палякі застаюцца пасля рускіх другой паводле колькасці нацыянальнай меншасцю Беларусі (294,5 тысячы па дадзеных перапісу 2009 г.). Больш за тое, улічваючы кампактны характар пражывання, палякі з’яўляюцца най-

больш значнай этнічнай групай краіны пасля беларусаў[18]. 16 чэрвеня 1944 г. у баі з немцамі ля вёскі Багданы Гродзенскай вобласці загінуў і быў пахаваны кіраўнік партызанскага атрада Арміі Краёвай Ян Піўнік “Пануры”. У 1988 г. адбылася эксгумацыя ягонага цела, якое было перавезена ў Польшчу. На пачатку 1990-х на месцы яго смерці жыхары Багданаў устанавілі помнік пасля працяглага супрацьстаяння з мясцовай уладай, якая так і не пагадзілася, каб на табліцы было згадана прозвішча камандзіра атрада АК і каб помнік нагадваў пра палякаў, якія змагаліся з немецка-фашысцкімі захопнікамі. Пасля ўсталявання помніка на ім з’явіўся самавольны надпіс фарбай на польскай мове: «Тут загінуў паляк партызан Ян Піўнік “Пануры”»[19].

Большасць “польскіх” помнікаў ахвярам Другой сусветнай вайны ўзнікла ў Беларусі ў часе кіравання А. Лукашэнкі. Параўнальны аналіз невялікага кола “польскіх” помнікаў сведчыць пра тэндэнцыі сучаснай палітыкі памяці. Беларускія ўлады не ігнаруюць згадкі пра знішчэнне польскага насельніцтва нацыстамі. Так выглядае інфармацыя на помніках, што паўсталі ў м. Глыбокае, в. Навумавічы Гродзенскага раёна і в. Сітніца Лунінецкага раёна. Пры гэтым любыя згадкі пра ўдзел у забойствах мірнага польскага насельніцтва беларускіх калабарантаў блакуюцца.

Надпісы на помніках польскім ахвярам савецкага рэжыму нічога не паведамляюць пра выканаўцаў злачынстваў. Менавіта так выглядае памятны камень у Баранавічах, на якім, між іншым, надпіс зроблены з грубай памылкай у беларускай мове, або помнік на магіле ксяндза Баляслава Корна ў Мастах, які быў забіты чырвонаармейцамі 23 верасня 1939 г. У такіх выпадках толькі храналагічныя звесткі, якія змешчаны на помніках, з’яўляюцца ўскоснай падказкай. Напрыклад, 1939 г. у польскай свядомасці асацыюецца з савецкім тэрорам. Менавіта такое пасланне мае надпіс на памятным крыжы ў Баранавічах або памятны камень на вайсковых могілках у Гродне. У беларускай калектыўнай памяці гэты год, насупраць, звязаны з пазітыўнай падзеяй – уз’яднаннем Заходняй Беларусі з БССР[20].

---

[18] Перапіс 2009 г. паказаў, што Беларусь мае тры буйныя этнічныя меншасці, якія налічваюць больш за 100 тысяч чалавек: рускія (каля 785 тысяч), палякі (каля 295 тысяч) і ўкраінцы (каля 159 тысяч). Чацвертая па колькасці нацыянальная меншасць (яўрэі) налічвае толькі 13 тысяч чалавек. Іншыя этнічныя групы размеркаваныя па ўсёй тэрыторыі краіны, і толькі польская меншасць пражывае кампактна, што з’яўляецца сур’ёзным фактарам у геаграфічным ды культурным ландшафце Беларусі.

[19] Электроннае паведамленне аўтару артыкула ад карэспандэнта “Gazeta Wyborcza” па Беларусі Андрэя Пачобута (Andrzej Poczobut). 2012-11-20.

[20] Заўважым, што паняцце *ўз’яднанне* выглядае досыць праблематычным, бо менавіта *ўз’яднання* Заходняй Беларусі і Савецкай Беларусі не было, таму што Заходняя Беларусь ніколі не належала да БССР. Фактычна пад лозунгам уз’яднання адбылася савецкая акупацыя Ўсходняй Польшчы. Як вядома, у верасні 1939 г. у адпаведнасці з пактам Молатава-Рыбентропа Заходняя Беларусь была акупавана Савецкім Саюзам і нацысцкай Германіяй. Савецкае *вызваленне* распаўсюдзіла сталінскую сістэму гвалту і тэрору на насельніцтва заходняй часткі рэспублікі. Гл.: Gross 1988; Kotljarchuk 2004.

Замоўчваецца, як і раней, тэма савецкага тэрору супраць польскага насельніцтва. Адзінае вядомае выключэнне – памятная шыльда ў лідскім касцёле св. Барбары, якая прысвечана памяці жаўнераў Арміі Краёвай, дзе на польскай мове згадваюцца жыхары лідскай зямлі, якія сталі ахвярамі сталінскага таталітарызму. І гэта нягледзячы на тое, што польскі парламент прыняў у 2009 і 2012 гг. дзве заявы наконт масавага тэрору супраць этнічных палякаў СССР. Як вядома, толькі падчас адмысловай "польскай аперацыі" супрацоўнікамі НКУС (НКВД) быў арыштаваны і забіты патаемна без суду 111 091 чалавек, з іх у БССР 17 772 чалавекі (Петров, Рогинский 1997). Заява Сейма Польскай Рэспублікі ад 31 жніўня 2012 г. з нагоды 75-годдзя пачатку "польскай аперацыі" змяшчае заклік да постсавецкіх гісторыкаў даследаваць гэтую трагічную старонку мінулага (Uchwała 2012).

У ліпені-снежні 2012 г. у публічнай прасторы незалежных СМІ разгарнулася вострая дыскусія наконт устаноўкі помніка жаўнерам Войска Польскага ў Курапатах. Курапаты (сёння ў межах Мінска) – найбуйнейшае ў Беларусі месца масавых расстрэлаў, якія выконваліся ў часе сталінскіх рэпрэсій 1937–1940 гг. 29 кастрычніка 2012 г. у Курапатах актывісты грамадскай арганізацыі "Мемарыял" усталявалі памятны знак у памяць афіцэраў Войска Польскага, якія былі закатаваныя ў Беларусі падчас сталінскіх рэпрэсій з надпісам: "Тут будзе ўсталяваны помнік афіцэрам польскага войска, забітым НКУС у 1940–1941 гг.". Адзін з ініцыятараў названага мемарыяльнага праекта – вядомы беларускі даследнік савецкага тэрору дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Ігар Кузняцоў. Па нейкім часе згаданы вышэй знак быў, аднак, знішчаны невядомымі. 29 лістапада сябры "Мемарыяла" ўсталявалі помнік зноў – памятны крыж з надпісам: "Памяці афіцэраў польскага войска, забітых у Беларусі НКУС у 1940–1941 гг." (Кузьняцоў 2012, Форум Радыё Свабода 2012, Пазьняк 2012а). Вядомыя лідары кансерватыўнай беларускай апазіцыі выступілі супраць помніка "палякам" у "пантэоне" беларускай трагедыі – Курапатах. Дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі гэтую тэму праігнаравалі. У сваім звароце, які быў зачытаны на мітынгу ў Курапатах, лідар Кансерватыўнай партыі Беларускага Народнага Фронту Зянон Пазьняк вызначыў сутнасць польскага помніка ў Курапатах наступным чынам:

> "Як адкрывальнік, дасьледчык і кіраўнік археалягічнага дасьледаваньня Курапатаў у 1988 годзе нагадваю, што на сёньняшні дзень няма абсалютна ніякіх падставаў і абсалютна ніякіх археалягічных фактаў, якія б давалі нагоду меркаваць, што ў Курапатах "расстраляныя афіцэры польскага войска" (і ўвогуле якія-небудзь вайсковыя асобы чыйго-небудзь войска). Тут знойдзеныя трупы толькі выключна цывільных людзей, і ў асноў-

> ным – бедных сялян, абутых у галёшы і клееныя гумовыя бахілы” (Пазьняк 2012b).

На з’ездзе партыі Зянон Пазьняк зноў адзначыў, што Курапаты з’яўляюцца пантэонам беларускай трагедыі, у якім іншым праектам памяці месца няма:

> “…Ні архіўнымі дакументамі, ні археалагічнымі дасьледаваньнямі не пацьверджана, што яны (катыньская група) былі расстраляныя і пахаваныя ў Курапатах. Месца іх зьнішчэньня пакуль невядомае і можа быць выяўлена дзе заўгодна – ніхто ня ведае. Таму нельга займацца авантурызмам і прывязваць абстрактныя меркаваньні да канкрэтнага месца. Яно можа аказацца зусім ня тут. Да такіх спраў трэба ставіцца сур’ёзна.... У канцовым выніку людабойства сьмяротны ўдар наносіўся па беларускай нацыі (а не па іншых), бо няма ў беларусаў іншага месца на Зямлі, акрамя Беларусі У 30–40-я гады ў Беларусі адбываўся мэтанакіраваны генацыд беларускага народа, які праводзілі расейскія бальшавікі, але не безадносны палітычны бальшавіцкі тэрор, як хацелі б назваць і прадставіць гэта пэўныя расейскія структуры” (Пазьняк 2012a).

Сцверджанне Зянона Пазьняка пра выключна беларускі і пераважна сялянскі характар ахвяраў курапацкай трагедыі мае супярэчлівы ды палітычны характар. Увогуле ў Курапатах даследавана толькі 4 % пахаванняў. З прычыны поўнай закрытасці архіваў НКУС/КДБ (НКВД/КГБ) Беларусі імёны ахвяраў Курапатаў застаюцца невядомымі, што дае нагоду для розных інтэрпрэтацый. Падчас эксгумацыі ў 1988 г. у Курапатах пад кіраўніцтвам Зянона Пазьняка былі знойдзены рэчы грамадзян балтыйскіх краін, што ўскосна сведчыць пра тое, што там забівалі таксама замежнікаў і што расстрэлы адбываліся і ў 1940–1941 гг. (Pozniak and Shmahalou 1994).

Гэтыя падзеі храналагічна супадаюць з Катынскай трагедыяй. У 1997–1998 гг. частковую эксгумацыю праводзіла вайсковая пракуратура Беларусі. Былі раскапаныя яшчэ 9 масавых пахаванняў. У адным з іх былі знойдзеныя зорачкі ад фуражак чырвонаармейцаў, хлясцікі, савецкія шынялі, то бок парэшткі камандзіраў і салдат Чырвонай арміі. У пахаванні, якое было адкрыта ў 2009 г., былі выяўлены рэшткі вайскоўца адной з балтыйскіх краін. Відавочна, што буйны сакрэтны расстрэльны палігон рэспубліканскага НКУС БССР, размешчаны недалёка ад балтыйскай мяжы СССР, выдатна падыходзіў для масавых расстрэлаў жыхароў Балтыі.

Матэрыялы выбаркавай эксгумацыі 1988 г. (скураное адзенне, акуляры, добрыя боты і г.д.) сведчаць, што значную колькасць ахвяраў складалі не сяляне (Pozniak and Shmahalou 1994). Гісторыкі, якія займаюцца Вялікім тэрорам, ведаюць, што сялянаў сярод ахвяраў Вялікага тэрору было наагул

мала (Котлярчук 2012). У часе адмысловых польскай, латышскай і нямецкай "национальных операций" НКУС 1937–1938 гг. у Беларусі вынішчыліся перадусім жыхары польскіх, нямецкіх і латышскіх паселішчаў (Раманава 2007, 73–101, Охотин, Рогинский 1999, Martin 1998, Iwanow, 1991; Репрессии против поляков и польских граждан 1997, Morris 2004). Асноўныя сялянскія ахвяры Вялікага тэрору ў Беларусі тыя, хто быў арыштаваны ў час "польскай аперацыі", то бок людзі, моцна звязаныя з рыма-каталіцкім касцёлам і польскай культурай. Асноўнымі ахвярамі рэпрэсій супраць вясковага насельніцтва 1939–1941 гг. былі жыхары заходнебеларускай правінцыі, часта старасты гмінаў, асаднікі польскага паходжання.

Памяць пра Курапаты і Катынь мусіць злучаць, а не падзяляць этнічныя групы сучаснай Беларусі. Падаецца, што памяць пра польскіх ахвяраў вайны ёсць найбольш праблематычнай для сучаснага кіраўніцтва Беларусі і беларускага грамадства. Кіраўнік краіны неаднаразова заяўляў, што, маўляў, Беларусь не мае архіўных крыніц, якія б сведчылі пра расстрэл у 1940 г. на тэрыторыі БССР ваеннапалонных польскіх афіцэраў. Тым часам асобныя даследнікі і журналісты сцвярджаюць, што гэтак званы "Беларускі Катынскі спіс" існуе і частку ахвяраў знішчылі на тэрыторыі БССР (Мікулевіч 2011).

У 2009 г. польскі ўрад звярнуўся да беларускіх уладаў з просьбай правесці расследаванне адносна ахвяраў брацкай магілы, якая была знойдзена ў сутарэннях каталіцкага касцёла Глыбокага. Польскія ўраднікі лічаць, што ахвярамі пахавання з'яўляюцца польскія грамадзяне, забітыя супрацоўнікамі НКУС СССР. Запыт быў сустрэты маўчаннем… Ні мясцовыя, ні цэнтральныя ўлады Беларусі працяглы час не каментавалі гэтага звароту. Нарэшце, на запыт польскіх уладаў адказаў кіраўнік аддзела ідэалогіі Віцебскага аблвыканкама Міхаіл Кузьміч: "Гэта ўсё датычыць далёкай гісторыі. Чаму мы павінны каментаваць нешта з мінулай эпохі – эпохі, сведкаў якой хутка не будзе ў жывых" (Rudling 2012, 46). Такім чынам, у выпадку з палякамі працягваецца савецкая палітыка замоўчвання. Невыпадкова, што ў Беларусі дагэтуль няма ніводнага памятнага знака, прысвечанага Катынскай трагедыі. Пры гэтым дзясяткі катынскіх помнікаў ёсць у Польшчы. Відавочна, што памяць пра Катынь не даспадобы сучаснаму беларускаму ураду. І гэта не зважаючы на тое, што немалую частку ваеннапалонных, якія былі расстраляныя пад Смаленскам на загад Сталіна і ягоных паплечнікаў, складалі выхадцы з Беларусі. Сярод іх былі не толькі этнічныя палякі, але і беларусы, беларускія яўрэі і татары. З аналагічнай прычыны грамадзяне Беларусі – былыя жаўнеры Войска Польскага і Арміі Краёвай – не атрымалі статус ветэранаў вайны.

У 2008 г. згодна з рашэннем урада Беларусі каля вёскі Калдычава Баранавіцкага раёна быў збудаваны першы і адзіны ў краіне мемарыяльны комплекс, прысвечаны польскім, яўрэйскім і цыганскім ахвярам Другой су-

светнай вайны. Вязні Калдычаўскага лагера (перадусім польскія партызаны, ксяндзы і інтэлігенцыя) былі знішчаны жаўнерамі 13-га “беларускага” батальёна дапаможнай паліцыі (*Weissruthenische-Polizei (SD)-Bataillon nr 13*), які выкарыстоўваў нацыянальную сімволіку, беларускую мову і выконваў загады калабаранцкай адміністрацыі. Шэраг былых паліцыянтаў Калдычава, якія не здолелі ў 1944 г. выехаць у краіны Заходняй Еўропы, былі пасля вайны арыштаваны ў Польшчы і СССР і асуджаны за ваенныя злачынствы трыбуналамі ва Ўроцлаве (1957 г.) і Мінску (1962 г.) (Шерман 1997). З аднаго боку, Калдычаўскі мемарыял адлюстроўвае сучасны “несавецкі” наратыў дзяржаўнай палітыкі памяці. Падкрэсліваецца этнічнае паходжанне ахвяраў. Надпісы, зробленыя на дзвюх дзяржаўных мовах сучаснай Беларусі (беларускай і рускай), прадубляваны таксама на мовах ахвяраў – цыганскай, ідыш і польскай. З іншага боку, мемарыял дэманструе хібы беларускай палітыкі памяці. Няма тэкстаў, якія адсылаюць да сувязі беларускай калабарацыі з гітлераўскім рэжымам і ролі 13 батальёна дапаможнай паліцыі ў знішчэнні вязняў Калдычаўскага лагера. Уся віна ўскладзена на нямецкіх акупантаў. Надпісы зроблены неахайна, з прыкрымі памылкамі: “Союз белорусских <u>еврейсов</u>”; “Памят<u>ь</u> замуч<u>а</u>ным в Колдычеве”; “Семьи <u>с </u>Беларуси”, што сведчыць пра маргінальную павагу выканаўцаў праекта мемарыяла да нацыянальных меншасцяў.

З дапамогай папулярных пісьменнікаў і мемуараў эмігранцкіх аўтараў некаторыя ваенныя злачынцы беларускага паходжання сёння зрабіліся героямі – змагарамі за незалежную Беларусь. У той самы час А. Лукашэнка робіць стаўку на савецкую канцэпцыю ўсенароднай барацьбы з нацызмам і аспрэчвае факт масавай калабарацыі беларусаў. У часе сваёй прамовы на ўрачыстым паседжанні з нагоды 65-годдзя перамогі ў вайне ў 2010 г. кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў:

> В последнее время даже дошло до диких рассуждений о том, что Беларусь якобы боролась не с фашизмом, а за свою независимость от других братских советских республик. И что в годы оккупации у нас чуть ли не велась гражданская война друг с другом, а пол-Беларуси ушло в полицию или служило у немцев. Наша принципиальная позиция остается неизменной: Великая Победа – это самое святое для каждого белоруса… А если и есть кучка таких нравственных уродов (иначе их нельзя назвать), которым близка идея “незалежнай Беларусі ў новай Эўропе Адольфа Гітлера”, они нам известны. Мы знаем, кому служили их кумиры в годы Великой Отечественной, и совершенно понятно, чьими лакеями они являются сегодня (Лукашенко 2010).

Малая колькасць польскіх месцаў памяці Другой сусветнай вайны ды іх маргінальны характар (адсутнасць мемарыяла ў сталіцы, аддаленае размяш-

чэнне ад буйных гарадоў), напэўна, тлумачацца актуальным палітычным курсам беларускай улады.

**Высновы**

Сучасныя тэндэнцыі палітыкі памяці другой сусветнай вайны ў Беларусі добра падсумаваць у параўнанні з працэсамі ва Украіне і Расіі. Каля 10 гадоў таму ва Ўкраіне быў зроблены крок у кірунку залагоджвання ўкраінска-польскага канфлікту 1943 г., які знайшоў падтрымку на дзяржаўным узроўні (Грицак 2004). Яшчэ 11 ліпеня 2003 г. прэзідэнты Польшчы і Ўкраіны Аляксандр Кваснеўскі і Леанід Кучма ўзялі ўдзел у жалобнай цырымоніі ў валынскай вёсцы Паўліўка (Poryck), дзе імі быў адкрыты першы помнік замірэння. З таго часу на Заходняй Украіне паўстаў шэраг польскіх мемарыялаў. Тым часам улады Беларусі абмінаюць увагай ці замоўчваюць беларуска-польскі канфлікт часоў вайны. Галоўнай прычынай, на маю думку, трэба лічыць нежаданне непазбежных у гэтым выпадку публічных дыскусій наконт масавасці беларускай калабарацыі.

У публічным дыскурсе Беларусі маргіналізавана дзейнасць украінскіх нацыяналістаў і аддзелаў Украінскай паўстанцкай арміі (УПА) на беларускім Палессі. У той час як на абшарах суседніх Луцкай і Жытомірскай абласцей за апошнія гады пабудавана шэраг манументаў салдатам УПА, у Беларусі няма ніводнага “ўкраінскага” мемарыяла Другой сусветнай вайны. І гэта нягледзячы на наяўнасць у краіне 160-тысячнай украінскай дыяспары, у тым ліку выхадцаў з заходняй Украіны. У лістападзе 2012 г. беларуская ўлада забараніла адкрыццё першай мемарыяльнай дошкі ў гонар УПА ў вёсцы Дзівін Кобрынскага раёна. Менавіта тут у кастрычніку 1942 г. было створана першае падраздзяленне УПА. У адмове брэсцкія чыноўнікі падкрэслілі, што ўшанаванне УПА не адпавядае “ўвекавечанню памяці важных гістарычных і грамадскіх падзей айчыннай гісторыі, вядомых дзяржаўных, палітычных, грамадскіх, ваенных дзеячаў, народных герояў” (Гезгала 2012).

Адначасова ў Беларусі аднаўляюцца дзясяткі расійскіх помнікаў вайны 1812 г. і Першай сусветнай вайны, якія, на думку той жа ўлады, маюць непасрэднае дачыненне да айчыннай гісторыі. У жніўні 2011 г. у Мінску на дзяржаўным узроўні адбылася цырымонія адкрыцця мемарыяла “Воинам русской императорской армии”, створанага паводле ўказа Лукашэнкі. На нашу думку, здзяйсняючы палітыку памяці падобнага кшталту, улады Беларусі свядома не адрозніваюць прадстаўнікоў рускага і беларускага этнасаў. Адной з прычын такога падыходу з’яўляецца асіміляцыйная палітыка ўрада. Імаверная мэта ўлады – зліццё беларускага і рускага этнасаў у адзіную рускамоўную супольнасць Беларусі. Статыстыка адлюстроўвае

першыя вынікі гэткай палітыкі. Як інакш патлумачыць тое, што колькасць этнічна рускага насельніцтва зменшылася ў Беларусі за 10 гадоў (1999–2009) ажно на трацiну (32 %). Пры гэтым масавай эміграцыі рускага насельніцтва з Беларусі ў Расійскую Федэрацыю не назіраецца.

Нарэшце, трэба адзначыць, што прасочваецца відавочнае падабенства ў палітыцы памяці, якая праводзіцца ў Беларусі і Расіі. Як і ў Расіі, мемарыялізацыя памяці генацыду цыганоў у Беларусі працякае марудна. Пры гэтым праблемы, звязаныя з ушанаваннем генацыду цыганоў на тэрыторыі Беларусі, як паказвае дадзены артыкул, абмежаваныя "path dependence", а не свядомай дыскрымінацыйнай палітыкай у дачыненні да цыганскага насельніцтва.

Складаныя дачыненні паміж урадамі Беларусі і Польшчы, арганізаваны дзяржавай падзел Саюза палякаў Беларусі, гістарычны недавер беларускіхураднікаў да палякаў, нежаданне прызнаць савецкія злачынствы адлюстроўвае запавольванне мемарыялізацыі польскіх мясцін памяці.

У той жа час мемарыялізацыя Галакосту ідзе ў Беларусі хуткімі тэмпамі, як і ў Расіі. За апошнія гады ў Расіі пабудаваны шэраг новых помнікаў, у Маскве адчыніліся два вялікія музеі, прысвечаныя Галакосту: мемарыяльная сінагога на Паклоннай гары і яўрэйскі музей і цэнтр талерантнасці. У Мінску ў 2002 г. адчыніў дзверы для наведвальнікаў невялікі музей гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі, у якім змешчана выстава, што распавядае пра Галакост. Імклівая мемарыялізацыя памяці яўрэйскага генацыду пацвярджае, што ў гістарычнай палітыцы сучаснай Беларусі адбываецца перагрупоўка савецкай гісторыі вакол новых наратыўных восяў. Калі зыходзіць з вышэйзгаданай класіфікацыі Джэфры Блутэнгера, Беларусь знаходзіцца разам з краінамі Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы ў другой фазе *deflective negotionism*. Галакост прызнаецца, але ўся адказнасць за яго пераносіцца выключна на немцаў. Варта адзначыць, што ў адрозненне ад савецкага часу палітыка памяці ў Беларусі пачынае будавацца на падставе агульнаеўрапейскай канцэпцыі замірэння (*reconciliation*).

Разбалансіроўка савецкага міфа вайны прыадчыніла замкнёныя шлюзы памяці. Гэта датычыць памяці Галакосту, генацыду цыганоў, масавых ахвяраў сярод польскага насельніцтва. Магчыма, што наступнымі актуальнымі тэмамі палітыкі памяці Другой сусветнай вайны ў Беларусі будзе асэнсаванне беларуска-польскага канфлікту, дзейнасці УПА, злачынстваў, здзейсненых савецкімі партызанамі, удзелу беларускіх калабарантаў у генацыдзе яўрэяў і цыганоў, сталінскіх дэпартацый і расстрэлу палякаў, якія здзяйсняліся ў 1939–1941 гг.



Мінскае ўрочышча “Яма” – помнік савецкіх часоў на месцы масавага забойства нацыстамі яўрэяў Мінска



Мінскае ўрочышча “Яма” – сучасны манумент



Мемарыял у Хатыні



Вянок ад прэзідэнта РБ А. Р. Лукашэнкі, ускладзены ў 2008 годзе каля помніка мінскага мемарыяла “Яма”



Мемарыял дзецям – ахвярам вайны “Красны Бераг”. 2007. Гомельская вобласць




Помнік знішчаным у генацыдзе цыганам. Мемарыял Калдычава




Помнік польскім ахвярам у Баранавічах




Памятная дошка польскім ахвярам
у каталіцкім касцёле св. Барбары.
Ліда



Польскія могілкі ў Гродне



Помнік у Пінску на месцы масавага
забойства нацыстамі яўрэяў, цыганоў,
партызанаў і падпольшчыкаў

***Спіс крыніцаў і літаратуры***

Altshuler, Mordechai, 2002. Jewish Holocaust Commemoration Activity in the USSR under Stalin // Yad Vashem Studies. Vol. 30. P. 221–240.

Baer, Ulrich, 2000. To Give Memory a Place: Holocaust Photography and the Landscape Tradition // Representations. № 69, Special Issue: Grounds for Remembering (Winter). P. 38–62.

Blutinger, Jeffrey, 2010. An Inconvenient Past: Post-Communist Holocaust Memorialization // Shofar: An Interdisciplinary Journal of Jewish Studies, Vol. 29: 1. P. 73–94.

Convention on the Prevention and Punishment of the Crime of Genocide, Adopted by the United Nation. New York, 9 December 1948.

Czerniakiewicz, Jan, 2004. Przemieszczenia ludności polskiej z ZSRR 1944–1959. – Warszawa.

Dean, Martin, 2000. Collaboration in the Holocaust: crimes of the local police in Belorussia and Ukraine, 1941–44. – New York: St. Martin's Press.

Epstein, Barbara, 2004. Allies in Resistance: Jews and Belarusians in German-Occupied Minsk // Collaboration and resistance during the Holocaust: Belarus, Estonia, Latvia, Lithuania / Gaunt, David, Levine, Paul A. & Palosuo, Laura (eds.). – Bern: Peter Lang. P. 431–458.

Ficowski, Jerzy, 1989. Cyganie w Polsce. Dzieje i obyczaje. – Warszawa.

Ganzer, Christian & Paskovic, Alena, 2010. Heldentum, Tragik, Tapferkeit. Das Museum der Verteidigung der Brester Festung // Osteuropa. 60 Jg. № 12. P. 81–96.

Gerlach, Christian, 1999. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weisrussland 1941 bis 1944. – Hamburg.

Gross, Jan Tomasz, 1988. Revolution from abroad: the Soviet conquest of Poland's western Ukraine and western Belorussia. – Princeton, N.J.: Princeton University Press.

Hedlund, Stefan, 2005. Russian path dependence. – London: Routledge.

Holler, Martin, 2008. Die nationalsozialistische Vernichtung der Roma in der sowjetischen und russischen Erinnerungskultur // Der nationalsozialistische Genozid an den Roma Osteuropas. – Köln: Böhlau Verlag. P. 245–294.

Jewish.Ru 2010. Последний еврей Глуска открыл памятник жертвам Холокоста // Глобальный еврейский онлайн центр [электронны рэсурс]. 14 мая. – Рэжым доступу: http://www.jewish.ru/news/cis/2010/05/news994285327.php. – Дата доступу: 22.04.2013.

Kapralski, Slawomir, 2012. Symbols and Rituals in the Mobilisation of the Romani National Ideal // Studies in Ethnicity and Nationalism. Vol. 12. Issue 1. P. 64–81.

Lubachko, Ivan, 1972. Belorussia under Soviet rule 1917–1957. – Lexington: Univ. Press of Kentucky.

Marples, R. David & Rudling, Per Anders, 2009. War and memory in Belarus: The annexation of the western borderlands and the myth of the Brest fortress, 1939–1941 // Białoruskie Zeszyty Historyczne. № 32. P. 225–244.

Morris, James, 2004. The Polish terror: Spy mania and ethnic cleansing in the Great terror // Europe-Asia Studies. Vol. 50. №. 5. P. 751–766.

Names and Numbers of Righteous Among the Nations – per Country & Ethnic Origin, as of January 1, 2012 // Yad Vashem [электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www1.yadvashem.org/yv/en/righteous/statistics.asp#detailed. – Дата доступу: 22.04.2013.

Nora, Pierre & Kritzman, Lawrence D. (eds.), 1996–1997. Realms of memory: rethinking the French past. Vol. 1, Conflicts and divisions; Vol. 2, Traditions. – New York.

Pazniak, Zenon & Shmahalou, Yauhen, 1994. Kurapaty – the road of the death. – Minsk.

Pickford, Henry W., 2005. Conflict and Commemoration: Two Berlin Memorials // Modernism/modernity, Vol. 12:1, January. P. 133–173.

Rein, Leonid, 2011. The kings and the pawns: collaboration in Byelorussia during World War II. – New York: Berghahn Books.

Rudling, Per Anders, 2012. The Khatyn Massacre in Belorussia: A Historical Controversy Revisited // Holocaust Genocide Studies. Vol. 26:1 (Spring). P. 29–58.

Schabas, William A., 2000. Genocide in International Law. – Cambridge University Press.

Schäuble, Michaela, 2011. How History Takes Place: Sacralized Landscapes in the Croatian-Bosnian Border Region // History & Memory. Vol. 23:1. P. 23–61.

Silitski, Vitali, 2005. A Partisan Reality Show // Transitions Online [электронны рэсурс]. 11 May. – Рэжым доступу: http://www.tol.org/client/article/14025-a-partisan-reality-show.html. – Дата доступу: 28.01.2013.

Stewart, Michael, 2004. Remembering without Commemoration: the Mnemonics and Politics of Holocaust memories among European Roma // Journal of the Royal Anthropological Institute. Vol. 10:3. P. 561–582.

Törnquist-Plewa, Barbara, 2006. Remembering World War II in Belarus. A struggle between Competitive Historical Narratives // History, Language and Society in the Borderlands of Europe. Ukraine and Belarus in Focus / ed. by Barbara Törnquist-Plewa. – Malmö: Sekel. P. 33–60.

Uchwała Sejmu Rzeczypospolitej Polskiej z dnia z dnia 31 sierpnia 2012 r. w sprawie hołdu wszystkim zamordowanym i represjonowanym na terenach Związku Radzieckiego w ramach tzw. Operacji Polskiej w latach 1937–1938 (M.P. z 2012 r., poz. 676) [электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://isap.sejm.gov.pl/DetailsServlet?id=WMP20120000676. – Дата доступу: 28.01.2013.

Vakar, Nicholas, 1956. Belorussia: the making of a nation: a case study. – Cambridge, Mass.: Harvard University Press.

Альтман, Илья, 2001. Отрицание Холокоста. История и современные тенденции. – Москва.

Басин, Я. З., 2009. Документы по проблеме увековечения памяти жертв Холокоста // Уроки Холокоста: история и современность: Сборник научных работ. Вып. 2. – Минск.

Беларуская савецкая энцыклапедыя, 1970. Т. 2. – Мінск. С. 265.

Беркофф, Карел, 2010. Поголовное уничтожение еврейского населения: Холокост в советских СМИ (1941–1945) // Голокост і сучасність. № 1 (7). Р. 62–122.

Браточкин, Алексей, 2013. Преодоление “советского прошлого” в Беларуси как проблема // Belarusian Center for European Studies [электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://eurocenter.by/studies/preodolenie-sovetskogo-proshlogo-v-belarusi-kak-problema. – Дата доступу: 22.04.2013.

Бахурин, Л. В., 2013. Перед судом памяти и совести // Penza.fsb.ru [электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.penza.fsb.ru/content/history/veterans2.html. – Дата доступу: 22.04.2013.

Венцель, Т., 1978. Цыгане // Большая Советская Энциклопедия. – Москва. Т. 28. С. 606–607.

Гарэцкі, Гаўрыла, 1929. Нацыянальныя асаблівасці насельніцтва БССР і беларускага насельніцтва СССР паводле перапісу 1926 г. // Полымя. № 3. С. 84–85.

Гезгала, Сяргей, 2012. Беларускія ўлады не дазволілі павесіць шыльду УПА ў беларускай вёсцы // Наша Ніва. 5 лістапада.

Грыбоўскі, Юры, 2006. Польска-беларускі канфлікт у Генеральнай акрузе "Беларусь" (1941–1944 гг.) // Białoruskie Zeszyty Historyczne. №. 25. S. 116–167.

------, 2007. Савецкія рэпрэсіі ў Заходняй Беларусі (кастрычнік 1939 – чэрвень 1941 г.) // Репрессивная политика советской власти в Беларуси / Сост. И. Кузнецов, Я. Басин. Т. 2. – Минск.

Деметр, Н., Бессонов, Н., Кутенков В., 2000. История цыган – новый взгляд. – Воронеж.

Дучыц, Ларыса, 2003. З гісторыі цыганоў Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. № 3. С. 45–49.

К'яры, Бернгард, 2005. Штодзённасьць за лініяй фронту: Акупацыя, каляборацыя і супраціў у Беларусі (1941–1944 гг.) / Пер. з ням. – Мінск.

Калинин, Вальдемар, 2005. Загадка балтийских цыган. – Минск.

Катлярчук, Андрэй, 2005. Рэцэнзія на: Gaunt David, Levine Paul A. and Palosuo Laura (eds). Collaboration and Resistance during the Holocaust. Belarus, Estonia, Latvia, Lithuania. Bern: Peter Lang, 2004 // ARCHE. № 3.

------, 2007. Рэцэнзія на: Bernhard Chiari. Alltag hinter der Front: Besatzung, Kollaboration und Widerstand in Weißrußland 1941–1944. Düsseldorf, 1998 // Ab Imperio. № 3. С. 482–492.

------, 2012. Другая сусветная вайна і новая гістарычная навука Скандынавіі // ARCHE. № 5. С. 166–172.

Котлярчук, Андрей, 2012. "В кузнице Сталина". Шведские колонисты Украины в тоталитарных экспериментах XX века. – Москва: Росспэн. (Серия: История сталинизма)

Ластовский, Алексей, 2009. Специфика исторической памяти в Беларуси: между советским прошлым и национальной перспективой // Вестник общественного мнения. № 4 (102). С. 88–99.

Лашкевич, Кастусь, 2008. Почему белорусские власти пересмотрели свое отношение к Холокосту // Белорусский портал TUT.BY [электронны рэсурс]. 3 ноября. – Рэжым доступу: http://news.tut.by/society/120668.html. – Дата доступу: 22.04.2013.

Левин, Л. М., 2010. К вопросу о мемориализации мест массового уничтожения жертв Холокоста на территории Беларуси // Уроки Холокоста: история и современность: Сборник научных работ. – Минск, Т. 3.

Лейзеров, А. Т., 2006. Некоторые аспекты отношения советского руководства к уничтожению еврейского населения на территории Белоруссии в годы оккупации // Актуальные вопросы изучения Холокоста на территории Беларуси в годы немецко-фашистской оккупации: Сборник научных работ. – Минск. Т. 2.

Литвин, Алексей, 2002. К вопросу о количестве людских потерь Беларуси в годы Великой отечественной войны 1941–1945 // Беларусь у XX стагоддзі. Vol. 1. – Минск.

Лицкевич, Олег, 2009. Людские потери Беларуси в войне // Беларуская думка. № 5. С. 92–97.

Лукашенко, Александр, 2004. Выступление на торжественном собрании, посвященном 60-й годовщине освобождения Республики Беларусь от немецко-фашистских захватчиков и Дню Независимости Республики Беларусь, 2.07.2004 / Афіцыйная старонка Прэзідэнта Рэс-

публікі Беларусь [электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://president.gov.by/press13450.html#doc. – Дата доступу: 22.04.2013.

Лукашенко, Александр, 2010. Стенограмма выступления на торжественном собрании, посвященном 65-й годовщине Великой Победы / Афіцыйная старонка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь [электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.president.gov.by/press88741.html. – Дата доступу: 22.04.2013.

Мавлоний, Дильбегим, 2010. В Ташкенте открыт памятник узбекскому солдату // Радио Азаттык [электронны рэсурс]. 14 января. – Рэжым доступу: http://rus.azattyq.org/content/uzbekistan_soldier_monument_replacement/1928938.html. – Дата доступу: 22.04.2013.

Машеров, Петр, 1965. Непреоборимая сила народная // Советская Белоруссия. 8 мая.

------, 1969. Речь на торжественном собрании, посвященном 25-й годовщине освобождения БССР от немецко-фашистских захватчиков // Советская Белоруссия. 5 июля.

Мікулевіч, Сяргей, 2011. Дакументы НКВД абвяргаюць Лукашэнку // Наша Ніва. 28 снежня.

Нічога не забудзем, нічога не даруем: Дакумэнты аб зверствах нямецкіх акупантаў на Беларусі, 1943. – Мінск.

Озаричи – лагерь смерти. Документы и материалы, 1999. – Минск.

Охотин, Н., Рогинский, А., 1999. Из истории немецкой операции НКВД 1937–1938 гг. // Репрессии против советских немцев. – Москва. С. 35–74.

Пазьняк, Зянон, 2012a. Маскоўскіх правакацыяў у Курапатах больш не павінна быць: Выступ на сьнежаньскім Сойме Беларускага Народнага Фронту // Беларуская Салідарнасьць [электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.bielarus.net/archives/2012/12/11/2912. – Дата доступу: 22.04.2013.

------, 2012b. Курапаты – 2012 год // Беларуская Салідарнасьць [электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.bielarus.net/archives/2012/10/29/2848. – Дата доступу: 22.04.2013.

Пасэ, У., 1994. Вялікая Айчыная вайна // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск. Т. 2. С. 433–434.

Перепись, 2011. Табл. 1.2. Динамика национального состава // Перепись населения 2009 г. – Минск. Т. 3. С. 8.

Петров, Н.В., Рогинский, А.Б., 1997. “Польская операция” НКВД 1937–1938 гг. // Репрессии против поляков и польских граждан. – Москва. С. 22–43.

Портнов, А., 2007. Упражнения с историей по-украински (заметки об исторических сюжетах общественно-политических дебатов в постсоветской Украине // Ab Imperio. № 3. С. 93–138.

Пресс-служба Президента Республики Беларусь, 2013. Глава государства принял участие в церемонии возложения венков в память 65-летия трагедии Минского гетто // Афіцыйная старонка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь [электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.president.gov.by/press63725.html#doc. – Дата доступу: 20.10.2008.

Радыё Свабода 2012. Кузьняцоў: У Курапатах кожны мае права ставіць крыжы // Радыё Свабода [электронны рэсурс]. 5 снежня. – Рэжым доступу: http://www.svaboda.org/content/article/24790382.html. – Дата доступу: 22.04.2013.

Раманава, Ірына, 2007. Жыццё ва ўмовах савецкага пагранічча. Беларускае пагранічча па савецкі бок дзяржаўнай мяжы ў 1930-я гг. // Pogranicza Białorusi w perspektywie interdyscyplinarnej – Памежжы Беларусі ў міждысцыплінарнай перспектыве. – Warszawa. С. 73–101.

Розенблат, Евгений, Еленская, Ирина, 2002. Динамика численности и расселения белорусских евреев в XX веке // Диаспоры. № 4. С. 27–52.

Розенблат, Евгений, 2003. Исследования истории Холокоста в Беларуси: шаг вперёд или топтание на месте? // Historycy polscy, litewscy i białoruscy wobec problemów XX wieku. – Białystok: Instytut Historii Uniwersytetu w Białymstoku. S. 49–60.

Рудлінг, Пэр Андэрс, 2010. Лукашэнка і "чырвона-карычневыя": дзяржаўная ідэалогія, ушанаванне мінулага і палітычная прыналежнасць // Палітычная сфера. № 14. С. 90–113.

Смиловицкий, Л. Л., 2010. Эвакуация и бегство из Турова. Лето 1941 г. // Уроки Холокоста: история и современность: Сборник научных работ. – Минск. Т. 3.

Сообщение 1944. Сообщение Чрезвычайной Государственной Комиссии по установлению и расследованию злодеяний немецко-фашистских захватчиков и из сообщников // Известия. 29 августа. № 205. С. 3.

Туронак, Юры, 2008. Кожны чацьверты і Курапаты // Мадэрная гісторыя Беларусі. – Вільня. С. 678–683.

Тяглый, Михайло, 2011. Бабин Яр як місце масового винищення українських ромів: типова модель? // Неопубликованный доклад на международной конференции "Бабин Яр: масове убивство і пам'ять про нього", Киев, 24–25 октября 2011 г.

Узники Озаричских лагерей вспоминают, 1999. – Минск.

Ушакин, Сергей, 2001. В поисках места между Сталиным и Гитлером: о постколониальных историях социализма // Ab Imperio. № 1. С. 209–233.

Форум Радыё Свабода 2012 [электронны рэсурс]. 1 лістапада. – Рэжым доступу: http://www.svaboda.org/content/interview/24757625.html. – Дата доступу: 22.04.2013.

Фрыдман, Аляксандр, 2004. Невядомы генацыд: знішчэнне беларускіх цыганоў у 1941–1944 гг. // ARCHE. № 2. С. 2–13.

Шерман, Б. П., 1997. Барановичское гетто. Колдычевский лагерь смерти. – Барановичи.

Шоўкун, Вольга, 2010. Помніць, нельга забыць // Астравецкая праўда. 28 ліпеня.